Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 1 1934 г. ЧАЦВЕР № 26 (4859) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Рабочы клас СССР моцны не толькі тым, што ў яго ёсць выпрабаваная ў баях ленінская партыя. Ён моцны, далей, не толькі тым, што мае падтрыманне мільённых мас працоўных сялян. Ён моцны яшчэ тым, што яго падпірае і яму дапамагае сусветны пролетарыят. Рабочы клас СССР ёсць частка сусветнага пролетарыята, яго перадавы атрад, а наша рэспубліка—дзецішча сусветнага пролетарыята“. **СТАЛІН.**

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Заслухаўшы 17 з'езда ВКП(б) па справаздачнаму дакладу т. СТАЛІНА аб рабоце ЦК ВКП(б)

(ПРЫНЯТА АДНАГАЛОСНА)

Заслухаўшы справаздачны даклад тав. СТАЛІНА аб дзейнасці ЦК ВКП(б), 17 з'езд ВКП(б) пастанаўляе:

1. Ухваліць цалкам і поўнасцю палітычную лінію і практычную работу ЦК ВКП(б).

2. Ухваліць справаздачны даклад тав. СТАЛІНА і прапанаваць усім партарганізацыям кіравацца ў сваёй рабоце палажэннямі і задачамі, высунутымі ў дакладзе тав. СТАЛІНА.

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 31 СТУДЗЕНЯ

На ранішнім пасяджэнні з'езда, яко адкрылася пад старшынствам тав. Постышава, прадаўжаліся спрэчкі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). У спрэчках выступілі т. т. **Прэабражэнскі, Швернік** (ВЦСПС), **Кабакоў** (Свярдлоўская вобласць), **Томскі, Кіраў.**

Першым на ранішнім пасяджэнні выступіў тав. Прэабражэнскі. Ён расказаў з'езду аб сваёй акцыйнай барацьбе супроць партыі за працягу раду год, ацэньваючы троцкізм як самую ганебную контрэвалюцыйную групу, якая змагалася і змагаецца за рэстаўрацыю капіталізма. Пекалькі разоў у сваім выступленні тав. Прэабражэнскі, спыняючыся на паасобных этапах сваёй барацьбы з партыяй у гадах трацкістаў—адкрытых і замаскаваных ворагаў пролетарскай рэвалюцыі,—паўтарае: «Мне соромна ўспамінаць аб гэтых днях»... Гаворыць аб сваіх памылках ужо пасля звароту ў партыю, тав. Прэабражэнскі заяўляе аб тым, што ён не здолеў у патрэбны перыяд выступіць супроць сваіх былых саратнікаў—трацкістаў, хоць пазнаваў ужо антыпартыйнасць іх пазіцый.

У заключэнне тав. Прэабражэнскі гаворыць аб тым, што ён глыбока ўсвядоміў сваю віну перад партыяй і хоць лічыць, што не дзлікая яго заслуга ў тым, што ён прышоў да гэтага так позна, але зараз ён гатоў аддаць усе свае сілы па выкананні грандыёзнай задачы, пастаўленай партыяй—па асновы бясклясавага грамадства.

Прамова тав. Прэабражэнскага раз перарываецца рэплікамі дэлегатаў, якія паказваюць, з якой старожанасцю адносяцца дэлегаты да заяў былога віднага трацкіста.

На трыбуну выходзіць тав. Швернік, спатканы апладысментамі.

Тав. Швернік у пачатку сваёй прамовы гаворыць аб тым, што вялікшыя перамогі, атрыманыя партыяй, сталі магчымы толькі таму, што ЦК нашай партыі здолеў мабілізаваць усе сілы партыі і рабочага класа вакол генеральнай лініі партыі.

Адказваючы тав. Прэабражэнскаму, тав. Швернік указвае, што Прэабражэнскі не мог змагацца з класавым ворагам толькі таму, што ён сам быў прадстаўніком і абаронцаю дробнабуржуазнай стыхіі і ён бачыў у ёй не класавага ворага, а тыя сілы, якія павінны справіцца з нашай партыяй.

Рэплікі дэлегатаў: Правільна.

— Тав. Сталіну перш за ўсё,— гаворыць тав. Швернік,—належыць найвялікшыя заслугі ў разгроме правых і «левых» апартуністаў. Апартуністы не верылі ў сілы рабочага класа, сумняваліся ў тым, што профсаюзы пад кіраўніцтвам партыі змогуць падняць масы на барацьбу за аўладанне новай тэхнікай.

Апартуністы заяўлялі, што новыя заводы павісну́ць мёртвым грузам. Але мёртвым грузам аказаліся самі апартуністы, і партыя правільна паступіла, саштырхнуўшы іх са сваёй ленінскай дарогі.

Характарызуючы рост рабочага класа, профсаюзных арганізацый, найнейшыя поспехі ў павышэнні матэрыяльна-бытавога ўзроўню працоўных, тав. Швернік падкрэслівае, што наш совецкі рабочы ўзнёс у заўтрашнім дні. Гэта ўзнёсласць—найвялікшая рухаючая сіла ў барацьбе за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

У другой пяцігодцы роля профсаюзных арганізацый пролетарыята ўзрастае яшчэ больш. Пад кіраўніцтвам партыі і вялікага правадыра т. Сталіна профсаюзы будуць пястомна змагацца за канчатковую перамогу соцыялізма.

Аб нязмерных гістарычных заслугах т. Сталіна ў арганізацыі соцыялістычных перамог у нашай краіне і ў прыватнасці ў стварэнні другой вугальна-металургічнай базы Саюза гаворыць выступіўшы пасля т. Шверніка т. **Кабакоў** (Свердлоўская вобласць).

Да рэволюцыі Урал, які мае велізарныя прыродныя рэсурсы, быў адсталай вобласцю і ў тэхнічных і ў вытворчых адносінах. Па месцы багатых залежаў калійных соляў стаялі манастыры і ўбогія саляварні Строганава. Металургічныя заводы, працаваўшыя на дрэўным вугалі, выпускалі метал самага нізкага гатунку. Цяпер няма Урала з прымітыўнай тэхнікай. У соцыялістычным Урале найбольш яркае ажыццявілася генеральная лінія партыі, абгрунтаваная т. Сталіным. На Урале ўзніклі такія прамысловыя гіганты, як Бярэзнікаўскі хімкамбінат, якім па праву могуць ганарыцца пролетарыі Совецкага Саюза. Узніклі цэлыя прамысловыя вузлы: Свердлоўскі, Пермскі, Чэлябінскі, Тагільскі, Калачынскі, Магнітагорскі і інш. За апошнія 3½ гады створана і пушчана 200 прадпрыемстваў. Пабудаваны 23 новыя галіны прамысловасці.

Поўнасцю асвоіць гэту новую магутную тэхніку, лепш арганізаваць вытворчасць, даць найвышэйшую прадукцыйнасць працы—вось задачы, якія стаяць перад большэвікамі і рабочымі Урала.

Пасля т. **Кабакова** слова прадастаўляецца **т. Томскаму.**

Прамова т. Томскага, прысвечаная разбору лініі правай апазіцыі, не раз перарываецца дэлегатамі з'езда.

Тав. Томскі прызнае, што платформа правых прадстаўляла сабой антыленінскую рэфармісцкую платформу, ажыццяўленне якой было-б на руку толькі класаваму ворагу і прывяло-б да перамогі класавага ворага.

Тав. Томскі гаворыць, што правая апазіцыя фармальна прытрымлівалася «рамак партыйнай легальнасці». Аднак, тут-жа заяўляе, што рамкі партыі аказаліся цеснымі для правай апазіцыі, і што іменна гэтым былі прадыктаваны яе нападкі на т. Сталіна, які ўвасабляе ў сабе адзінства партыі.

Дэлегаты з'езда патрабуюць ад т. Томскага расказаць аб яго сувязі з групай Эйсманта-Смірнова.

За гэтыя групоўкі мы нясем поўную адказнасць — заяўляе т. Томскі—у прыватнасці, мая блізасць са Смірновым давала магчымасць контрэволюцыйнай групоўцы Эйсманта-Смірнова прыкрывацца маім імем.

Тав. Томскі запэўнівае з'езд партыі ў сваёй гатоўнасці да канца змагацца за генеральную лінію партыі.

Апошнім у спрэчках па справаздачы Цэнтральнага камітэта выступае тав. **Кіраў.**

Калі старшынствуючы тав. Постышаў абвяшчае, што слова прадстаўляецца тав. Кіраву, дэлегаты ўстаюць і паладжваюць тав. Кіраву доўгую, бурную авацыю.

У паўтарагадзіннай прамове, праслуханай з неаслабнай увагай, часта перарываемай апладысментамі, тав. Кіраў гаворыць пра веліч ленінскай партыі, грандыёзныя перамогі, атрыманыя партыяй пад кіраўніцтвам ленінскага Цэнтральнага камітэта на чале з найвялікшым правадыром усіх часоў, усіх народаў — тав. Сталіным.

У святле гэтых вынікаў, — гаворыць тав. Кіраў, мізерна выглядалі выступаўшыя тут былыя лідэры ўсякіх апазіцый. Мне проста было іх шкода пачалавечаму. Я разумею, што іх становішча нялёгкае. Ім, вядома, было вельмі цяжка гаварыць перад з'ездам пераможцаў.

Але як тут стаіць справа?

Наша партыя павяла рабочы клас у рашучы бой. Ваенныя таварышы ведаюць, што калі ідзе бой, то бываюць, вядома, паасобныя хібы. Але ў рэзультаце гэтага боя мы заваявалі повыя вышыні. Усе тыя хібы, якія ў нас былі ў час боя, яны нішто ў параўнанні з дасягнутым.

У час боя часта з'яўляюцца такія, якія сумняваюцца ў мэтазгоднасці яго. Адны ўцякаюць з поля бітвы зусім, другія хаваюцца ў абозах. А армія ідзе наперад, яе гэта не стрымлівае. Ёй няма справы да тых, хто адстаў, хто дэзэртыраваў у рашаючы момант боя з поля бітвы.

Так і наша партыя пайшла ў вялікае соцыялістычнае наступленне, атрымліваючы адну перамогу за другой. І, нарэшце, атрымала поўную перамогу. Ну, а нашы апазіцыянеры засталіся ў абозе.

Наша партыя на чале з яе геніяльным камандзірам тав. Сталіным, паспяхова праводзячы баі за пабудову соцыялізма ў нашай краіне, натхнёная адзіным пачуццём захаплення, спявае гімн перамогі.

А што-ж рабіць абознікам? **(Смех. Апладысменты).**

Яны, слухаючы наш пераможны гімн, прабуюць уключыцца ў агульны хор. Але выходзіць гэта ў іх дрэнна. Вось я слухаў тут тав. Бухарына. Спявае як быццам-бы нічога, проста як на нотах, а голас усё-ж не той. І выходзіць, і не выходзіць.

Што-ж датычыць выступаўшых тут т. т. Рыкава і Томскага, то ў іх нават і па нотах не выходзіць. Я разумею, што ім цяжка ўключыцца адразу ў нашы рады. Пройдзе яшчэ некаторы час, калі, нарэшце, гэта абозная рацэ сальецца з намі.

Наш з'езд — з'езд пераможцаў. Нашы перамогі сапраўды грандыёзны. Мы іх дабіліся дзякуючы таму, што мы маем геніяльнага кормчага, вернага храніцеля прынцыпаў марксізма-ленінізма, непрымірымага барацьбіта за чыстату марксіцка-ленінскага вучэння, майстра марксіцка-ленінскага аналіза, мы маем такога правадыра, як тав. Сталін. **(Бурныя апладысменты).**

Бурай апладысментаў сустракаюцца словы тав. Кірава аб тым, што будзе правільна не прымаць з'езду ніякіх рэзалюцый, акрамя адной: прыняць да выканання ўсё, што было сказана тав. Сталіным, і пасапраўднаму, пачэснаму, набольшэвіцку ператварыць у жыццё.

З велізарнейшым натхненнем тав. Кіраў заяўляе, што ленінградскія пролетарыі былі не ў апошніх радах барацьбы за справу Леніна-Сталіна, яны і надалей будуць магутным перадавым атрадам, які аддасць усе свае сілы на падтрыманне і ў далейшым ленінскага Цэнтральнага камітэта, на ператварэнне ў жыццё вялікіх задач пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

На скамчэнні прамовы з'езд налажвае тав. Кіраву чорную авацыю. Апладысменты, крыкі «ура», «няхай жыве ленінградскі пролетарыят», «няхай жыве кіраўнік ленінградскіх большэвікоў тав. Кіраў» не змаўкаюць у залі на працягу некалькіх мінут.

Пасля прамовы тав. Кірава з'езд пастанаўляе спыніць спрэчкі па справаздачнаму дакладу тав. Сталіна.

«Заключнае слова прадастаўляецца тав. **Сталіну...** — гаворыць старшынствуючы тав. Постышаў. І апошнія словы тонуць у нестуваным узрыве апладысментаў.

Магутнае большэвіцкае «ура» сутрасае залу. З'езд устае. Адусюль крыкі: «Няхай жыве вялікі Сталін», «Няхай жыве геніяльны майстар пролетарскай рэволюцыі тав. Сталін», «Няхай жыве верны саратнік і прадаўжальнік справы Леніна тав. Сталін». На працягу многіх мінут прадаўжаецца авацыя, якая выражае адданасць, бязмежную любоў к таму, які высокае сцяг Маркса-Энгельса-Леніна.

СТАЛІН: Таварышы! Спрэчкі на з'ездзе выявілі поўнае адзінства поглядаў нашых партыйных кіраўнікоў, можна сказаць, па ўсіх пытаннях партыйнай палітыкі. Пярэчанняў супроць справаздачнага даклада, якведаеце, не было ніякіх. Выявілася, значыць, натхнёйная ідэйна-палітычная і арганізацыйная згуртаванасць рашэй нашай партыі. **(Апладысменты).**

Паўстае пытанне: ці ёсць пасля гэтага патрэба ў заключным слове? Я думаю, што няма такой патрэбы. Весь чаму дазволце мне атмовіцца ад заключнага слова **(Бурная авацыя.** Увесь з'езд устае. Грамавое «ура», калектыўныя воклічы: «Няхай жыве Сталін». З'езд пае «Інтэрнацыянал». Пасля выканання «Інтэрнацыянала» аванья апладысменты. Крыкі: «ура», «Няхай жыве Сталін», «Няхай жыве ЦК»).

Слова для ўнёсак мае тав. Хрушчоў. — заяўляе старшынствуючы т. Постышаў.

Тав Хрушчоў ад імя маскоўскай, ленінградскай і украінскай делегацый уносіць праект пастановы па справаздачнаму дакладу т. Сталіна аб рабоце ЦК ВКП(б).

Поўныя захаплення апладысменты. крыкі «ура», «Няхай жыве Ленінскі Цэнтральны Камітэт», «Няхай жыве вялікі Сталін» — быў адказам на гэту прапанову.

Старшынствуючы т. Постышаў галасуе зачытаны праект пастановы.

За — галасуюць усе дэлегаты супроць — ніхто, устрымаўшыхся — таксама няма.

Пастанова прынята **адналасна.**

Повыя апладысменты, крыкі «ура».

Затым з'езд адналасна прымае рэзалюцыю па справаздачы Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Калі ўстанавілася цішыня, слова прадастаўляецца т. Енукідзе для паведамлення. Тав. Енукідзе даводзіць да ведама з'езда наступнае сумнае паведамленне.

Учора, 30-га, паміж 15 г. 30 мінут і 17 гадзінамі дня ў Інсарскім раёне, Мардоўскай вобласці, каля сяла Пашкі Острог за 8 клм. на поўдзень ад станцыі Капоцінка Маскоўска - Казанскай чыгункі ўпала апарэўнаяся гандола стратастата «Асоавіяхіма» № 1». Аба лопка ад удара абвалілася і ўляцела. У гандоле знойдзены трупы ўдзельнікаў палёту т. т. Федасеенка, Васенко, і Усыскіна.

З апытаннаў сведак устаноўлена наступная карціна аварыі: Пры падыходзе стратастата абалонка збарзалася і пры гэтым былі чуты два ўзрывы. На месцы знойдзены тры трупы загінуўшых таварышоў, ляжаўшых у гандоле. Адзін скалечаны да непазнавальнасці.

Усе прадметы і прыборы, якія знаходзіліся ў гандоле, разбіты. На месца катастрофы для расследвання выехала спецыяльная камісія.

З'езд ушанаваў памяць загінуўшых таварышоў уставаннем і па прапанове прэзідыума вынес рашэнне пахаваць прах герояў совецкага лётніцтва на Красной плошчы ў Крамлёўскай сцяне.

***

На гэтым ранішняе пасяджэнне закрылася.

Увечары 31-га студзеня з'езд засядае не будзе.

Чарговае пасяджэнне з'езда заўтра ў 11 гадзін раніцы.

ПРЫВІТАННІ БРАЦКІХ КОМПАРТЫЙ

Комуністычнай партыі Совецкага Саюза

МАСКВА.

Комуністычная партыя **ПАЗШ** пасылае самыя гарачыя прывітанні міжнароднай салідарнасці XVII з'езду комуністычнай партыі Совецкага Саюза, які замацоўвае вялікія перамогі рабочага класа, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі **Леніна** і яго лепшага вучня **Сталіна.** Узор упартага правядзення ў жыццё лініі партыі, растучых перамог соцыялістычнага будаўніцтва, ахапляючага зараз усю гаспадарку, на аснове бязлітаснай барацьбы з усімі ўхіламі, з'яўляецца натхняючым прыкладам для рабочых Амерыкі і ўсяго свету, які паказвае адзіны выхад з крызіса для рабочага класа. Супроць пагрозы імперыялістычнай інтэрвенцыі мы аб'ядноўваем рабочыя масы для абароны Совецкага Саюза.

Няхай жыве **ВКП(б)** і яе ленінскае кіраўніцтва!

Няхай жыве сусветная комуністычная партыя пад кіраўніцтвам тав. **Сталіна!**

Няхай жыве сусветны Окцябр!

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі ПАЗШ:
ФОСТЭР — старшыня.
БРОЎДЭР — сакратар.

Цэнтральнаму камітэту комуністычнай партыі

МАСКВА. СССР.

Пленум **ЦК КПФ** вітае XVII з'езд і грандыёзныя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, дасягнутыя дзякуючы правільнай ленінскай лініі і арганізацыйным метадам партыі і ЦК пад кіраўніцтвам т. **Сталіна.** Пленум будзе натхняцца прыкладам большэвіцкай партыі ва ўсёй сваёй рабоце.

Сакратарыят Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Францыі.

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 30 СТУДЗЕНЯ

На ранішнім пасяджэнні 30-га студзеня, якое адкрылася пад старшынствам тав. ПОСТЫШАВА, прадаўжаліся спрэчкі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

У спрэчках выступілі т. т. ШУБРЫКАЎ (сярэдняя Волга), ШАПАШНІКАВА (Ленінград), АНЦІПАЎ, АНДРЗЕЎ, С. КАСІОР, РЫКАЎ.

ТАВ. ШУБРЫКАЎ гаворыць аб велічы СТАЛІНА, як геніяльнага прадаўжальніка справы Леніна. — Сталін развіў і дапоўніў вучэнне Маркса і Леніна аб шляхах сусветнай пролетарскай рэволюцыі і пабудове бясклясавага соцыялістычнага грамадства. Імя Сталіна стаіць побач з імем Маркса і Леніна. Тав. Шубрыкаў падрабязна спыняецца на пытанні аб барацьбе з засухай у Заволж'і і падкрэслівае, што хоць засуха 1933 г. была самай вялікай за апошнія 50 год, сельская гаспадарка Заволж'я, не гледзячы на гэта, не толькі не адступіла назад, а наадварот, дала павышэныя показальнікі ў параўнанні з папярэднімі гадамі.

Дэлегат ленінградскай арганізацыі тав. Шапашнікава асаблівую ўвагу ў сваім выступленні звярнула на культурны рост рабочага класа, прыводзячы яркія факты, якія сведчаць аб размаху і сіле нашага культурнага развіцця.

Тав. Шапашнікава гаворыць аб поспехах ленінградскай партарганізацыі пад кіраўніцтвам выпрабаванага кіраўніка ленінградскіх большэвікоў тав. КІРАВА.

ТАВ. АНЦІПАЎ на прыкладах партыйнай чысткі і перабудовы совецкага апарата падкрэслівае ўзор нае кавіраўнае кіраўніцтва з боку ЦК нашай партыі і тав. СТАЛІНА.

З вялікай прамовай выступіў нарком шляхаў тав. АНДРЭЕЎ, спатканы доўгімі апладысментамі. Тав. Андрэеў, падкрэсліваючы сусветна-гістарычнае значэнне перамог дасягнутых партыяй за перыяд ад XVI да XVII з'езда, гаворыць аб нязмернай, найвялікшай ролі правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

Тав. Андрэеў падрабязна спыняецца на задачах, якія стаяць перад чыгуначным транспартам на шляхах ліквідацыі яго адставання ад патрабаванняў усёй народнай гаспадаркі.

Мы даб'емся таго, — заяўляе тав. АНДРЭЕЎ, — каб наш транспарт стаў першым у свеце па стане яго тэхнічнай узброенасці і па якасці яго штодзённай работы. Гэтую задачу пад кіраўніцтвам геніяльнага нашага кіраўніка тав. СТАЛІНА мы безумоўна вырашым.

Заключныя словы тав. Андрэева пакрываюцца апладысментамі з'езда.

Тав. С. КАСІОР, спатканы бурнымі доўгімі апладысментамі заяўляе, што вялікай прамова рассказвае з'езду аб той велізарнай дапамозе, якую аказаў тав. СТАЛІН і ЦК ВКП(б) украінскай партыйнай арганізацыі ў яе барацьбе па ліквідацыі прарыву ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці Украіны, па разгрому нацыяналістычных элементаў і нацыяналістычнага ўхілу Скрыпніка.

Тав. Касіор гаворыць, што КП(б)У не зрабіла своечасова ўсіх выводаў з указанняў тав. Сталіна, які яшчэ на 16 з'ездзе завастраў нашу ўвагу на павышэнні рэволюцыйнай класавай пільнасці і ў гэтым, у слабасці нашай барацьбы за рэалізацыю ўказанняў Сталіна—асноўная прычына тых прарываў, з якімі прышлося ў нас на Украіне мець справу.

Буйнейшыя недахопы ў арганізацыйным кіраўніцтве з'явіліся таксама адной з сур'ёзнейшых прычын стварыўшагася ў 1931-32 г. на Украіне прарыву.

Калі мы ліквідавалі акругі, — гаворыць тав. Касіор,—тав. СТАЛІН указаў нам, што мы не здолеем з Харкава непасрэдна кіраваць усімі 500 раёнамі рэспублікі, што нам патрэбна арганізаваць вобласці. Мы позна ўзяліся за рэалізацыю гэтага сталінскага ўказання, і ў спазненні з ажыццяўленнем гэтай парады тав. Сталіна нам прышлося урэшце, раскайвацца.

Тав. Касіор расказвае далей аб тых поспехах, якіх КП(б)У у 1933 годзе дабілася ў рэзультаце таго, што яна пачала паслядоўна і няўхільна праводзіць у жыццё дырэктывы і ўказанні тав. СТАЛІНА, дырэктывы і ўказанні ЦК партыі.

Пад бурныя доўгія апладысменты тав. Касіор заканчвае словы выражэннем цвёрдай упэўненасці, што наша партыя, узброеная багацейшым вопытам, узброеная востра адточанай зброяй марксізма-ленінізма, маючы на чале вялікага правадыра тав. СТАЛІНА, з поспехам вырашыць задачу пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства.

ТАВ. РЫКАЎ сваё выступленне прысвячае аналізу сваіх палітычных памылак. — Барацьба правай апазіцыі, адным з кіраўнікоў якой я быў супроць партыі, трапа на руку класаваму ворагу, — гаворыць тав. Рыкаў. Правапартыйныя тэорыі лілі вазу на інтэрвенцыяністкі млын; правая апазіцыя, з'яўляючыся агентурай кулака, тармазіла і зрывала справу соцыялістычнага будаўніцтва, аблягчала, супраціўленне капіталістычных элементаў нашаму соцыялістычнаму наступленню.

Тав. Рыкаў гаворыць аб велізарнай гістарычнай ролі тав. СТАЛІНА ў разгроме правага ўхілу, аб ролі т. Сталіна, як правадыра партыі, аб грунтаваўшага тэорыю будаўніцтва соцыялізма ў адной краіне, аператыўна кіруючага правядзеннем гэтай тэорыі ў жыццё.

У заключэнне тав. Рыкаў запэўняе з'езд, што ён пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна будзе разам са сваёй партыяй актыўна змагацца за справу пролетарскай рэволюцыі.

Пасля выступлення тав. Рыкава ранішняе пасяджэнне з'езда закрываецца.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 30 СТУДЗЕНЯ

На вячэрнім пасяджэнні з'езда, якое адкрылася пад старшынствам тав. ПОСТЫШЭВА, па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) у спрэчках выступілі т.т. РАЗУМАЎ (Усходня-Сібірскі край), ЮРКІН (Наркамсоўгасаў); апошнім з вялікай прамовай выступіў тав. К. Е. ВАРАШЫЛАЎ.

Тав. РАЗУМАЎ прысвяціў сваю прамову аналізу прычын адставання Усходня-Сібірскага края. Старое краёвае партыйнае кіраўніцтва не здолела арганізаваць работу так, як гэтага патрабаваў Цэнтральны Камітэт у сваіх указаннях. Зараз, пасля змены кіраўніцтва, большэвікі край змагаюцца за тое, каб вывесці край у шэрэнгу перадавых абласцей і рэспублік Саюза.

Тав. НІКАЛАЕВА агалашае прывітанне ад цэнтральных камітэтаў комуністычных партый Польшчы, ПАЗШ, Францыі—17 з'езду ВКП(б)—перадавому атраду сусветнага комунізма.

Доўгімі і шумнымі апладысментамі адказвае з'езд на гэтыя прывітанні.

Тав. ЮРКІН у сваёй прамове гаворыць аб абсалютнай правільнасці той суровай ацэнкі, якую даў тав. СТАЛІН у сваім дакладзе рабоце наркамата соўгасаў. Тав. Юркін заяўляе, што суровая крытыка тав. СТАЛІНА мабілізуе ўсіх работнікаў соўгасной сістэмы на рашучае перамаганне буйнейшых недахопаў, якія ёсць у соўгасах, і на ператварэнне апошніх ва ўзорныя гаспадаркі.

Кароткі перапынак. Абвешчана, што наступным выступае т. ВАРАШЫЛАЎ. І, нечакаючы канца перапынку, хутка запаўняюцца дэлегатамі месцы. У зале стаіць бесперапынны гул чакання.

І як толькі старшынствуючы тав. Постышэў сказаў: «Слова даецца тав. Варашылаву»,—уся зала, як адзін чалавек, устае і бурнай авацыяй сустракае правадыра непераможнай Чырвонай арміі.

Пад нязмоўкную буру апладысментаў т. Варашылаў выходзіць на трыбуну. Авацыя ўзмацняецца, грыміць шматразовае «ура», з усіх бакоў выгукі: «Няхай жыве т. Варашылаў». Апладысменты і прывітальныя воклікі доўга не даюць магчымасці т. Варашылаву пачаць сваю прамову.

Тав. К. Е. Варашылаў гаворыць аб тым, што XVII з'езд гэта першы з'езд большэвіцкага поўнага адзінства і велізарных перамог соцыялістычнага будаўніцтва. Зноў грымяць апладысменты калі т. Варашылаў успамінае, як 10 год таму назад, калі не стала вялікага Леніна, а ўвесь цяжар работы пёг на плечы яго друга і зброеносца СТАЛІНА. І Сталін не дрогнуў, не пабаяўся труднасцяй, ён выканаў з гонарам сваю вялікую клятву, ён, Сталін, горда і высока падняў сцяг ЛЕНІНА і павёў народ наперад, па шляху соцыялізма.

Тав. Варашылаў спыняецца на задачах, якія стаяць перад сельскай гаспадаркай і транспартам, пасля гаворыць аб тым, як вырасла тэхнічная магутнасць Чырвонай арміі дзякуючы неаслабнаму, выдатна му кіраўніцтву т. СТАЛІНА і ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ.

Зал, горача вітаючы т. Варашылава, штохвілінна дружна апладзіруе, у чым выражаецца бязмежная любоў мільёнаў працоўных да сваёй жалезнай арміі, якую не зломяць ніякія сілы ў свеце.

Па скамчэнні прамовы т. К. Е. Варашылава, выслуханай з'ездам з велізарнай напружанай увагай, дэпутаты ўстаюць і нападжваюць аднаму з лепшых саратнікаў т. Сталіна —правадыру Чырвонай арміі доўгую гарачую авацыю.

Магутным «ура», грамавымі сутрасаючымі скляпенні прывітальнымі воклікамі, ураганам воплескаў падмацоўвае з'езд большэвікоў-пераможцаў выказаную т. ВАРАШЫЛАВЫМ непахісную ўпэўненасць у несакрушальнай магутнасці вялікай Краіны Советаў, яе спаўнай гераіч наі пераможнай Чырвонай арміі.

(БЕЛТА).

Прычына катастрофы стратастата „Асоавіяхім“

У ноч з 30-га на 31-е студзеня, як толькі стала вядома аб катастрофе стратастата «Асоавіяхім», на месца здарэння выехала аўтарытэтная камісія ў складзе: праф. Мэлчанава — старшыні навуковай камісіі, пра вераўшай і запячатаўшай прыборы стратастата перад пускам, камандзіра стратастата «СССР» тав. Прокоф'ева і ряду іншых адказных асоб.

Рэзультаты абследвання камісіі чакаюцца ў бліжэйшыя гадзіны.

Аднак, ужо зараз можна думаць, што стратастат гапярнуў крушэнне з-за таго, што аднесены моцным паветраным цячэннямі ад Маскавы ў паўднёва-ўсходнім напрамку, ён на вялікай вышыні папаў у выключна цяжкія атмасферныя ўмовы.

Заслугоўвае вялікай увагі радыёграма, прынятая ў 15 клм. ад Гомеля радыёаматарам т. Неклюевым. Згодна паведамлення т. Неклюева, ён 30-га студзеня з 12 г. 45 мінут да 13 г. 05 мінут прыняў на свой прыёмнік на хвалі 220-250 метраў наступнае паведамленне:

«Увага, гаворыць стратастат, перадатчык «Сірыус»... Паведамляйце аб гэтым... Экіпаж палаў у зону асадкаў, аблезяніеў. Мы знаходзімся ў бязвыхадным становішчы... Знаходзіць лены льдом... Два маіх таварышы... энергічнай, сваёй работы на ным становішчы... ляістычнага будаўніцтва... Гэта паведамленне... раёнах і кутках ных, патрэбуе яшчэ... ціны. Гэта абавязвай праверкі.

Больш дакладны... гонару кожнага чыне ідэі стр... правда»).

Пасля скамчэння

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу т. СТАЛІНА аб рабоце ЦК ВКП(б)

З ПРАМОВЫ тав. КАСІОРА

— На сваім XVII з'ездзе партыя падводзіць вынікі вялікіх перамог у сацыялістычнай перабудове краіны. За 3½ гады, якія адасобляюць нас ад XVI з'езда, мы пераможна завяршылі першую пяцігодку, паспяхова закончылі першы год другой пяцігодкі, забяспечылі ў вёсны перамогу калгаснага ладу. Гэтыя поспехі, гэтыя вялікія дасягненні заваяваны намі ў бесперапынным і ўпартым перамозе гадні вялікіх труднасцяй. Гэтыя труднасці выпачаліся класавай абстаноўкай, якая склалася ў краіне. Класавая барацьба прыняла найвастрэйшыя формы. Хоць мы ўжо к моманту XVI з'езда разграмілі «левых» і правых апартуністаў, хоць мы яшчэ на XVI з'ездзе чулі пакаянныя прамовы былых апазіцыйных лідэраў, мы і за апошнія гады мелі справу з астаткамі разгромленых апазіцыйных груп і групачак. Нават былыя правацыры правай апазіцыі, пакаўшыся, ўсё яшчэ аглядваліся назад: а вось, моў, выйдзе па-ранейшаму. Іх пазіцыя не магла не аблягчаць супраціўлення класавага ворага.

Перамагаючы ўсякія апартуністычныя настроі, разграмляючы класавага ворага, мы за апошнія 3½ гады вырашылі ўсе карэнныя пытанні сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Мы паспяхова перамаглі ўсе труднасці; мы атрымалі рашаючую перамогу, не гледзячы на гэтыя труднасці, дзякуючы выключна ўмеламу ленінскаму кіраўніцтву ЦК, дзякуючы генеральнай празорлівасці вялікага правадыра партыі т. **Сталіна.** Высокую якасць кіраўніцтва, ажыццяўляемага ЦК ВКП(б) і т. Сталіным, лепш за ўсё можна прадэманстраваць на прыкладзе Украіны. Дапушчаныя КП(б)У памылкі ў сельскай гаспадарцы выклікалі трывогу ва ўсёй нашай партыі. Тая акалічнасць, што прарыў на Украіне ліквідаван — сёння для ўсёй нашай партыі.

І гэтым святам мы перш за ўсё абавязаны выключнай увазе да украінскіх спраў, якую увесь час ЦК ВКП(б) праяўляе.

Бясспрэчна апраўдаліся указанні т. **Сталіна,** зробленыя ім яшчэ на XVI з'ездзе, аб тым, што нашы труднасці — труднасці класавай барацьбы, якія патрабуюць для сваёй перамогі перш за ўсё класавай пільнасці і большэвіцкай непрымірымасці.

КП(б)У, да якой гэтыя сталінскія словы перш за ўсё і раней за ўсё адносіліся, не зрабіла з іх свае часова неабходных практычных вынікаў. Мы не зразумелі складанасці абстаноўкі, не забяспечылі такой якасці кіраўніцтва, якой склаўшыяся абставіны ад нас патрабавалі. Замест таго, каб павысіць сваю пільнасць, мы яе аслабілі. Замест таго каб падняць агітацыйнае кіраўніцтва з боку КП(б)У, мы дапусцілі аслабленне гэтага кіраўніцтва. Недастатковая ўвага да арганізацыйных пытанняў адыграла ў пагаршэнні украінскага прарыву вялікую ролю. У момант, калі патрабаванні, прад'яўляемыя да кіраўніцтва, нязмерна выраслі, мы перайшлі да непастаднага кіраўніцтва з Харкава 500-мі самастойнымі раёнамі.

Спасылкі з ажыццяўленнем парады т. Сталіна—арганізаваць вобласці—прычыніла вялікую шкоду справе. Цяпер нават дзіўна падумаць, як гэта мы маглі ўзяцца за такую яўна безпатэйную справу, як непасрэднае кіраванне з аднаго цэнтра многімі сотнямі самастойных адміністратыўных адзінак. За гэту сваю памылку мы дорага заплацілі.

З вялікім спазненнем прыступілі мы да арганізацыі абласцей. Але мала было стварыць вобласць. Неабходна было ще на словах, а на справе зверху да нізу перабудаваць усю сістэму нашага арганізацыйнага кіраўніцтва. Мы гэтага своечасова не зрабілі і на працягу амаль двух год не маглі выйсці з прарыва на сельскагаспадарчым фронце.

Толькі пасля гістарычнай прамовы тав. **Сталіна** на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК, толькі пасля яго ўказанняў аб тым, як выйсці з прарыву, толькі пасля гэтага пачаўся пералом.

Гэты пералом — прамы рэзультат непасрэднай дапамогі ПК ВКП(б), рэзультат цэлага ряду правезеных ім арганізаваных мер: вядомая пастанова ЦК ВКП(б) ад 24 студзеня 1933 года, указанні ПК КП(б)У і украінскіх абласт[illegible] [illegible] буйных па[illegible] 9 ГАДЗІН 56 [illegible] матэрыяльнымі «СІРЫУС»[illegible]ручамі, насеннем і 15.000 метраў на[illegible]ратура — м'ін[illegible]ачнай спецыяльнай Украіне, забяспечылі тыя [illegible]ыемствы, якія былі праведзены па асабістай ініцыятыве тав. Сталіна, і ў першую чаргу арганізацыя палітаддзелаў і новы закон аб хлебазгадачы.

Гістарычны сталінскі лозунг «зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі» ускалыхнуў і натхніў калгасныя масы і забяспечыў пералом у іх адносінах да калгаснай вытворчасці.

У рэзультаце ўсяго гэтага 1933 год прынёс нам на Украіне ліквідацыю прарыву ў сельскай гаспадарцы, забяспечыў арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, забяспечыў вялікую перамогу.

Зноў і зноў успамінаецца роля **Сталіна.** Кожны з нас кіруючых работнікаў ведае, якую дапамогу аказвае тав. Сталін мясцам, мясцовым работнікам. Яму, галоўным чынам, мы абавязаны вялікімі рэзультатамі прайшоўшага перыяда гістарычнай важнасці і дасягненнямі, якіх мы за гэтыя гады дабіліся.

Ліквідацыя ў найкарацейшы тэрмін украінскага прарыву ясна паказала, што справа не ў «аб'ектыўных умовах», а ў якасці работы на мясцах, у якасці мясцовага кіраўніцтва.

Нельга не сказаць аб тым, што КП(б)У не вяла дастатковай барацьбы з нацыяналістычным ухілам, яна не ўлічыла ўсёй складанасці класавай абстаноўкі на Украіне, не ўлічыла таго, што тут класавы вораг маскуецца галоўным чынам нацыяналістычнай вопраткай, прыкрываецца нацыяналістычным сцягам, што тут нацыянальны момант адыгрывае выключную ролю. Контрэволюцыйныя элементы, інспірыруемыя і натхняемыя зарубежнымі контрэволюцыйнымі арганізацыямі, замежнымі контрразведкамі, прабавалі скарыстаць нацыянальныя забабоны для таго, каб шкодзіць нам пад сцягам ілжэукраінізацыі. У нацыянальным пытанні мы дапусцілі найбольш буйныя памылкі і гэтым ускладнілі справу. Самай вялікай памылкай я лічу тое, што мы праспалі нацыяналістычны ўхіл і нацыяналістычнае перараджэнне Скрыпніка. Ужо к 16 з'езду асноўныя элементы скрыпнікаўскага ўхілу пачалі выпіраць знутры, але мы своечасова работы не перабудавалі і ўсё аставалася па старому.

У нас нацыяналістычныя элементы акапаліся не толькі ў цэлым радзе совецкіх устаноў, но толькі ў цэлым радзе культурных арганізацый, але і ўнутры самой партыі, і гэта надзвычай ускладніла работу па ліквідацыі прарыву. Барацьбу з нацыяналістычным ухілам мы разгарнулі з вялікім спазненнем, але потым пад непасрэдным кіраўніцтвам т. Сталіна, па яго ўказаннях мы барацьбу з нацыяналістычнымі элементамі акты візавалі і правялі. Разгром нацыяналістаў адразу ачысціў на Украіне палітычную атмасферу. Толькі цяпер кожны з нас, адчуваючы павышэнне боездольнасці партыі, узмацненне яе ўзброенасці, бачыць, як неабходна была разгорнутая барацьба з нацыяналістычнымі элементамі, з нацыянал-ухілістамі. Тое, што мы разграмілі нацыяналістаў, тое, што мы пасапраўднаму ўзяліся за работу ў вёсцы, прадвызначыла наш поспех 1933 г.

Паміма сельскай гаспадаркі, мы мелі на Украіне пэўны прарыў і на фронце вугалю і на фронце металургіі. Гэта паказвае, што прарыў у сельскай гаспадарцы вядомым чынам перадаецца і ў прамысловасць, і там перашкаджае рабоце.

Невыпадкова, што пасля таго, як мы ў 1933 годзе дабіліся карэннага пералому ў вясковай рабоце, мы пры дапамозе ЦК ВКП(б) і тав. Сталіна, дабіліся поспеха і ў Данбасе. Мы ў Данбасе ніколі не мелі таго, што маем зараз. Раней здабыча вугалю там прадстаўляла сабой крывую зігзага-падобную лінію з вялікімі хіснаннямі ўверх і ўніз.

Моцную і ўстойлівую здабычу мы маем у Данбасе ўпершыню. І гэта наша перамога па вугольным фронце — выключная заслуга ЦК ВКП(б) і асабіста т. **Сталіна,** які сваімі ўказаннямі, сваёй практычнай дапамогай памог нам нанесці сакрушальны ўдар папярова-бюракратычнаму кіраўніцтву ў вугольнай прамысловасці. Я думаю, што выдатны прыклад Данбаса неабходна падрабязна апісаць і зрабіць здабыткам усёй партыі.

Мы маем значныя поспехі і ў металургіі. Гэтыя поспехі абумоўлены таксама тым, што дзякуючы найвялікшаму націску ЦК ВКП(б), дзякуючы найвялікшаму націску т. Сталіна, мы і ў металургіі сталі рашуча перабудоўваць метады кіраўніцтва.

Прыклад Данбаса, прыклад украінскай вугольнай і металургічнай прамысловасці паказвае, якіх бліскучых поспехаў можна дабіцца, калі пабольшэвіцку, пасталінску мабілізаваць партыю, мабілізаваць рабочыя масы.

Тав. Касіор далей спынімецца па задачах, якія нам прадстаяць вырашыць у другую пяцігодку, і падкрэслівае, што к вырашэнню гэтых задач неабходна шабаявому прыступіць ужо сёння, зараз, неадкладна.

Зернавую праблему мы вырашылі. Але ці значыць гэта, што мы ўжо заваявалі ўстойлівы высокі ўраджай? Не, не значыць. Высокай і ўстойлівай ураджайнасці мы яшчэ не дабіліся, а хлеба нам трэба многа і пры тым хлеба таннага.

Перамогу ў барацьбе за ўраджай неабходна падрыхтаваць, разгарнуўшы своечасова і пабаявому перадпасеўныя работы.

Многа яшчэ астаецца нам зрабіць і на фронце барацьбы за тэхнічныя культуры. З адной з тэхнічных культур, якая для Украіны з'яўляецца асноўнай — з бурякамі, — справа стаіць нядобра. Ураджайнасць буракоў нездавальняючая, малая. Для таго, каб дабіцца высокага ўраджаю буракоў, неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на гэтую новую галіну калгаснай гаспадаркі, правільна арганізаваць працу ў калгасах, якія сеюць буракі. А тым часам сур'ёзнай работы ў гэтым напрамку да гэтага часу праведзена не было. Справу павышэння ўраджайнасці бурачных плантацый павінны ўзяць у свае рукі партыйныя арганізацыі.

Тав. Касіор указвае на тое, што поспехі ў вырашэнні зернавой праблемы стварылі спрыяючыя прадпасылкі для развіцця жывёлагадоўлі. Калгасы і калгаснікі праяўляюць вялікую цягу да жывёлагадоўлі, імкнуцца набыць жывёлу. Мы з поспехам вырашым жывёлагадоўчую праблему, як вырашылі зернавую, калі прыкладзем да яе партыйную руку.

Заключную частку сваёй прамовы т. Касіор прысвячае палітычнай абстаноўцы, у якой будзе разгортвацца барацьба за ажыццяўленне другога пяцігадовага плана. Тав. Касіор падкрэслівае, што ў другой пяцігодцы мы яшчэ будзем мець справу з супраціўленнем астаткаў разгромленага класавага ворага. Тав. Касіор успамінае, што ў чэрвені 1933 г. тав. **Сталін** на нарадзе пры ЦК ВКП(б) указаў, што ў цяперашні час для таго, каб ліквідаваць ушчэнт астаткі класавага ворага, астаткі кулацтва, ад комуністаў патрабуецца перш за ўсё асаблівая загартаванасць, павышаная пільнасць, бязлітаснасць да класавага ворага. Мы не павінны забываць, што жывём у капіталістычным акружэнні, што нянавісць разгромленага класавага ворага падтрымваецца зарубежнымі антысавецкімі сіламі. Расхлябанасць і нядбайнасць многіх комуністаў — сіла нашага ворага. Калі ўся партыя мабілізавана і гатова, астаткі ворага будуць разбіты. А для гэтага неабходна перш за ўсё падняць ідэйны ўзровень нашых партыйных радоў, узброіць усю партыю тэарэтычнай зброяй Маркса-Леніна-Сталіна.

Партыйнае кіраўніцтва на чале з т. Сталіным падняло партыю на небывалую вышыню.

З'езд дэманструе тут выключную, небывалую згуртаванасць партыі, яе маналітнасць у барацьбе з усімі ворагамі сацыялізма. Вакол з'езда згуртавалася не толькі ўся партыя, але і найшырэйшыя масы рабочых і калгаснікаў, гатовых да канца змагацца за сацыялізм.

За рубяжамі Совецкай краіны мільёны людзей — адны з захапленнем, другія з нянавісцю сочаць за нашай партыяй. Узброеная аграмадным вопытам, узброеная вострым арточа[illegible] зброяй марксізма-ленінізма, маючы такога правадыра, як т. Сталін, наша партыя з поспехам ажыццяўляе справу пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадства, — заканчвае т. Касіор пад бурныя доўгія апладысменты ўсёй залы.

З ПРАМОВЫ тав. АНДРЭЕВА

Тав. Андрэева з'езд сустракае доўгімі апладысментамі. Сваю прамову т. Андрэеў пасвячае пытанням чыгуначнага транспарта.

— Я думаю,—гаворыць, ён — што можна без усякага перабольшання сказаць, што перыяд ад XVI да XVII з'езда—самы выдатны і слаўны перыяд у рабоце нашай партыі. У корані змянен твар краіны, створана свая цяжкая індустрыя. Арганізацыяй соўгасаў і калгасаў, ліквідацыяй кулацтва як класа створан новы лад у сельскай гаспадарцы, назаўсёды пахаваны дробна-сялянская вёска, небяспека звароту капіталізма. Не гледзячы на труднасці, не гледзячы на велізарнае напружанне, партыя пераможна прайшла ўвесь гэты шлях—дабілася такіх тэмпаў у будаўніцтве сацыялізма, дабілася такога развароту яго таму, што ёю кіраваў т. Сталін.

У ліку задач, пастаўленых тав. Сталінам, карэннай задачай з'яўляецца паляпшэнне работы транспарта. Транспарт у нас знаходзіцца ў найбольшай неадпаведнасці з гаспадарчым развіццём краіны.

За першую пяцігодку магутнасць таварнага паравознага парку у нас узрасла на 43 проц., колькасць вагонаў — на 17 проц. Чыгуначная сетка павялічылася на 11 тыс. клм.—з 93 тыс. да 104 тыс. Пракладзена 8 тыс. клм. новых станцыйных шляхоў. Пабудавана каля 15 буйных чыгуначных мастоў. Рост грузазвароту за першую пяцігодку ў параўнанні з 1928 годам склаў 179 проц., а грузазварот аднаўленчага перыяда —1925 год—перавышае ў 3 з палавой разы. Значна ўзраслі пасажырскія перавозкі. У 1928 г. было перавезена 291 млн. пасажыраў, у 1933 г.—967 млн. Сутачны прабег таварных вагонаў павысіўся на 18 проц., а ў параўнанні з 1925 г.—на 43 проц. Сутачны прабег таварных паравозаў узрос супроць 1925 года на 34 проц. Гэтыя паказальнікі гавораць аб перамозе планавай социялістычнай гаспадаркі, бо ні ў дарэволюцыйны час, ні зараз у Еўропе і Амерыцы няма такога высокага скарыстання чыгуначнага абсталявання як у СССР.

Аднак, транспарт не спраўляецца з перавозкамі, яго работа зусім недастаткова. Значна расце нагрузка на транспарт, растуць патрабаванні да транспарта. Даволі прывесці такія лічбы: зараз стаяць без руху каля мільёна вагонаў з грузамі, у прыватнасці, з лесам і дрывамі 430 тыс. вагонаў і 76 тыс. вагонаў з вугалем, неабходным для прамысловасці і самога чыгуначнага транспарта. Ляжыць без руху аграмадная колькасць тавараў шырспажыву, руды і т. д. Штосутачная нагрузка складае цяпер 53-54 тыс. вагонаў. Гэта на 7 тыс. вагонаў больш супроць студзеня мінулага года, але гэта не здавальняе патрэб народнай гаспадаркі, перш за ўсё металургіі і апалавай прамысловасці.

Дзе прычыны транспартных труднасцяй?

У нас сур'ёзныя арганізацыйныя недахопы ў рабоце чыгуначных дарог і апарата. Гэтыя недахопы можна выразіць коратка: у нас яшчэ вельмі мала парадку, страшэнна многа безгаспадарчасці. Яшчэ нізкая дысцыпліна, а гэта— асноўная ўмова для такой цэнтралізаванай гаспадаркі, якою з'яўляецца транспарт, дзе патрабуецца найвялікшае напружанне сіл.

У рэзультаце нізкай дысцыпліны і дрэннага рамонту рухомага састава—вагонаў і паравозаў—адбываюцца шматлікія аварыі. Яшчэ не выкаранены канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва. На транспарце—падзвычай шмат загадаў і слабое іх выкананне. Няма яшчэ таго, каб зверху і данізу на справе было ажыццёўлена адзінапачалле.

Няма належнай увагі да падбору кадраў. Яны часта змяняюцца. Вельмі бывае рэдка, каб начальнік дэпо прапрацаваў на адным месце 3 гады. У большасці ён працуе менш года. Пры такой цякучасці кадраў не можа быць і гутаркі аб правільным вядзенні гаспадаркі.

Тав. Сталін глыбока праў, гаворачы аб тым, што чыгуначны транспарт можа і пры цяперашнім стане працаваць лепш. Для гэтага ёсць рэзервы. Даволі ўказаць на зварот вагонаў. З 225 гадзін вагон у руху знаходзіцца 68 гадзін, пад нагрузкай і выгрузкай—52 гадзіны і на стаянках — 105 гадзін. Няўжо, паскорыўшы зварот вагона, нельга атрымаць тысячы дадатковых вагонаў для адпраўкі грузаў?

Паравоз працуе ў дарозе 11 з пал. гадзін, а для яго снабжэння, манеўравання, чакання на станцыях і ў дэпо траціцца 12 з пал. гадзін. Няўжо нельга за кошт скарачэння прастояў атрымаць фактычна яшчэ 2-3 тыс. паравозаў? Можна. Трэба толькі лепш працаваць, на справе правесці арганізацыйную перабудову ў адпаведнасці з пастановамі ЦК і Соўнаркома, прынятымі на ініцыятыве т. Сталіна. Гэтыя пастановы нам удалося часткова ажыццявіць, сціснуць грамоздкі апарат і спрасціць яго структуру. Апарат чыгуначных дарог з 69 тыс. скарочан да 39 тыс. чалавек. Зроблена перакідка ІТР. На першае ліпеня 1933 г. на лініі працавала 32 проц. інжынераў, а на 1-е снежня ўжо 68 проц.; тэхнікаў на 1-е ліпеня працавала 65 проц., на 1-е снежня—85 проц.

Другая прычына адставання чыгуначнага транспарта — велізарная зношанасць яго асноўных сродкаў, тэхнічная адсталасць, неадпаведнасць велізарнейшаму размаху прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Транспарт стаў вузкім месцам у сістэме народнай гаспадаркі. Усе галіны народнай гаспадаркі развіваюцца шпарка, а чыгуначны транспарт павольна змяняе свой тэхнічны твар. Шляхі зношаны.

У рэзультаце — аварыі і несвоечасовае зношванне рухомага састава. Многа на чыгуначнай сетцы гнілых шпал. У велізарнай неадпаведнасці з нагрузкай баластны пласт, пераважна пясчаны, які не вытрымлівае нагрузкі.

Паравоз устарэў. Амаль палова паравозаў працуе звыш 20-25 год. Вагон-каробка стаў таксама мал для грузаў, якія перавозяцца. Вагонаў не хапае, каб расставіць іх па ўсіх раёнах і бесперабойна прымаць грузы.

Што трэба зрабіць, каб у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць адставанне транспарта? Нам трэба моцна ўзяцца за ўсе звенні транспарта адначасова. Гэта — адна складаная машына, усе часткі яе павінны адпавядаць адна другой. Больш за ўсё трэба будзе націснуць на вагонную і шляхавую гаспадарку. У нас ёсць 550 тыс. вагонаў. Мы павінны вагоны-каробкі берагчы, прывесці іх у парадак, аздаравіць. Трэба лепш рамантаваць вагоны і лепш іх скарыстоўваць. Але вагонны парк, які ёсць у нас, не адпавядае размаху ўзрастаючага грузапатоку. Нам патрэбен велікагрузны рухомы састаў, пераважна адкрыты.

Ужо ў гэтым годзе транспарт атрымае каля 38 тыс. вялікагрузных, а за ўсю другую пяцігодку—80 тыс. такіх вагонаў. Трэба ўсямерна паскорыць пабудову магутнага вагонабудаўнічага завода ў Тагілі. Трэба, каб прамысловасць прыстасавала старыя вагоны да выпуску вагонаў новага тыпу.

Другая галіна транспарта, якая патрабуе неаслабнай увагі,—гэта шляхавая гаспадарка. Шляхі мы павінны рэканструяваць так, каб можна было атрымаць большую скорасць для паяздоў і магчымасць вазіць больш цяжкія паязды. Работа па рэканструкцыі шляхоў пачалася ўжо. У 1933 годзе шчэбневы баласт укладзен на тысячу з лішкам кіламетраў шляхоў. У 1934 годзе намечана пакрыць шчэбнем 1.340 клм. чыгуначнага палатна і за апошнія гады пяцігодкі — 21 тыс. клм. Побач са зменай баласта трэба абнавіць і рэйкавае пакрыцё. У бліжэйшыя гады на магістральных кірунках павінны ляжаць рэйкі аднаго тыпа, а не розныя, якія прымушаюць мяняць скорасць. Мы павінны даць дарогам больш цяжкія тыпы рэек. За пяцігодку намечана замяніць існуючыя рэйкі новымі, цяжкага тыпу рэйкамі на адлегласці 40 тыс. клм., а ўжо ў гэтым годзе—3.800 клм.

Трэба змяніць гнілыя шпалы. У гэтым годзе на галоўных магістралях мы павінны перайсці да ўкладкі прапітаных шпал. Мы зараз шмат трацім на зношванні шпал, бо звычайная шпала вытрымлівае 5 год, а прапітаная—15-20 год.

Наступнае пытанне — паравозы. У другой пяцігодцы ў нас будзе 5.800 паравозаў, з іх 2.000 магутных, 430 цеплавозаў і 450 электравозаў. Гэтыя тыпы машын выпрабаваны і даюць бліскучыя рэзультаты. Значыць, трэба ўзмацніць прапускную здольнасць асноўных магістральных напрамкаў, рэканструяваць існуючыя шляхі і ўкласці другія шляхі. Агульная колькасць другіх шляхоў, якія трэба ўкласьць за пяцігодку,—каля 13 тыс. клм. Галоўныя лініі другіх шляхоў: Свердлоўск—Казань—Масква——150 клм.; усходні выхад Данбаса — Валуйкі — Пенза — 500 клм.; Орэнбург — Казалінск — 980 клм.; Свердлоўск — Кацельніч — 940 клм. Будуць па-будаваны другія шляхі таксама на поўнач к Архангельску і т. п.

Новых чыгуначных ліній для поўнага асваення грузазвароту будзе пабудавана ў другой пяцігодцы каля 10 тыс. клм. Галоўная з іх—двухшляхавая лінія Масква—Данбас, затым Магнітагорск—Акмалінск, якая дае магчымасць жыўіць вугалем Магнітагорск; Байкала-Амурская магістраль, другія шляхі Лепінск — Новасібірск, Караганда — Балхаш, Рубцоўка — Усць — Каменагорск, Ачынск — Енісейск, Уфа — Магнітагорск, Чорнаморская дарога і інш.

Мы павінны хутчэй рушыць на перад электрыфікацыю чыгунак, якая дае велізарныя перавагі. Даволі сказаць, што электравоз бярэ састаў у 2½ разы большы, чым цяперашні паравоз. Трэба электрыфікаваць у гэтай пяцігодцы каля 5 тыс. клм. чыгунак, галоўным чынам на Урале, у Кузбасе і Данбасе. На электрыфікаваных дарогі перавозіцца ўвесь прыгарадны рух у Маскве, Ленінградзе і Харкаве.

У выніку гэтых работ мы будзем мець 3 двухшляхавыя магутныя магістралі — ад цэнтра па ўсход, чатыры двухшляхавыя ад цэнтра на поўдзень, адну двухшляхавую ад Данбаса на ўсходні напрамак. Старая Пермская дарога значна абнаўляецца і электрыфікуецца. Магутныя шляхі атрымлівае Данбас. Вырашаецца пытанне аб лепшай сувязі з Сярэдняй Азіяй. Вырашаецца пытанне і аб [illegible] вялічэнні прапускной здольнасці талоўных напрамкаў.

Нарэшце, важнейшае пытанне — аўтаматызацыя і механізацыя транспарта. Гэта павінна даць [illegible] вялічэнне хуткасці следавання [illegible] паяздоў, забяспечыць максімальную [illegible] безаварыйнасць руху. Мала ўвесці магутныя паравозы. Трэба перавесці рухомы састаў з ручнога торма[illegible] на аўтаматычны. У бягучым [illegible] дзе 33 проц. рухомага састава ад[illegible] сталёўваюцца аўтаматычнымі тормазамі, і ў 1935 годзе будзе по[illegible] нашу закончан пераход на аўтаматычны тормаз.

Нам трэба ўмацніць развіццё аўтаматычнай блакіроўкі і аўтаматычнай сігналізацыі. У Амерыцы 150 тыс. клм. чыгуначных шляху пераведзена на аўтаматычную блакіроўку. Поезд ідзе адзін за другім. У нас аўтаблакіроўка таксама пачала ўкараняцца. Гэта дае магчымасць замест 40 пар паяздоў на адным перагоне пропускаць 100 пар. За 2 гады мы ўкараналі на аўтаблакіроўку 15 [illegible] клм. шляху.

Вось канкрэтная праграма ажыццяўлення якой дасць магчымасць ліквідаваць адставанне транспарта і ператварыць яго ў руках партыі ў магутны ватар [illegible] роднай гаспадаркі. Патрабуюцца [illegible] велізарныя сродкі і асабліва [illegible] га метала. Але мы можам пайсці на гэту рэканструкцыю, бо маем метал. Мы можам і павінны пайсці на пераабсталяванне чыгуначнага гаспадарку, бо далейшае не адсталванне затармозіць тэмпы бурна растаючых перавозак.

Трэба, каб прамысловасць мабілізавала ўсе сілы для дапамогі транспарту. Трэба закончыць пабудову заводаў транспартнага машынабудаўніцтва, якія будуюцца [illegible] ініцыятыве т. Сталіна: Луганскага, Оскага, Капырскага, Казанскага, Тагільскага і Верхнедзвінскага. Работы па рэканструкцыі транспарта будуць залежаць ад работы [illegible] нікаў прамысловасці. Пад'ём і рэканструкцыя чыгуначнага транспарта — справа не толькі чыгуначнікаў, але і ўсёй партыі, усёй краіны. Са стварэннем [illegible] лаў усе краіны, абласныя і [illegible] ённыя партыйныя арганізацыі [illegible] павінны аслабляць работу [illegible] транспарце, а ўзмацняць [illegible] павінны ўскрываць недахопы і [illegible] тэматычна дапамагаць транспарту. У нас на чыгуначных дарогах не ўсё дрэнна, ёсць і добрае, ёсць [illegible] чыгуначнай гаспадаркі. Але [illegible] гэта часта тоне ва многіх і вялікіх недахопах.

Усе партыйныя арганізацыі павінны дапамагчы транспарту перайсці на высокую тэхнічную [illegible] пень, выйсці з труднасцяй. Пар[illegible] арганізацыі павінны акружыць увагай кожную чыгуначную будоўлю. Тады праз 2-3 гады мы па[illegible] лепшым работы і будзем мець [illegible] ры социялістычны чыгуначны транспарт. І тут мы можам выгуляць калкрэтную зоначку—дапамагаючы і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніцы і рабоце транспарта і мы гэтага дабіемся. Гэта задача будзе вырашана пад генеральным кіраўніцтвам тав. **Сталіна. (Бурныя апладысменты)**

„ВЯДОМА, СМЕШНА І ЗАБАЎНА, ШТО ГЭТЫЯ ЛЮДЗІ, НЯЗДОЛЬНЫЯ НАЛАДЗІЦЬ ПРАСЦЕЙШУЮ СПРАВУ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ, БАЛБОЧУЦЬ АБ СВАЁЙ ГАТОЎНАСЦІ НАЛАДЗІЦЬ БОЛЬШ СКЛАДАНУЮ І ЦЯЖКУЮ СПРАВУ ПРАМОГА ПРАДУКТААБМЕНУ. АЛЕ ДОН-КІХОТЫ ТАМУ І НАЗЫВАЮЦЦА ДОН КІХОТАМІ, ШТО ЯНЫ НАЗБАЎЛЕНЫ ЭЛЕМЕНТАРНАГА ПАЧУЦЦЯ ЖЫЦЦЯ". (СТАЛІН)

„ВОСЬ ВАМ ФІЗІЯНОМІЯ БАЛБАТУНА. ЯНЫ МАБІЛІЗАВАЛІСЯ, ПАСТАВІЛІ ПЫТАННЕ РУБАМ, [illegible] ІХ І ПЕРАЛОМ, І ЗРУХІ, А СПРАВА НЕ РУШЫЦЦА З МЕСЦА.... ЯК БЫЦЬ З ГЭТЫМІ НЕВЫПРАВІМЫМІ БАЛБАТУНАМІ? КАЛІ-Ж ІХ ПАКІНУЦЬ НА АПЕРАТЫЎНАЙ РАБОЦЕ, ЯНЫ ЗДОЛЬНЫ ПАТАПІЦЬ ЛЮБУЮ СПРАВУ Ў ПАТОКУ ВАДЗЯНІСТЫХ І БЯСКОНЦЫХ ПРАМОЎ". (СТАЛІН)



Малюнкі Вал. Мядзьведзева

*) Радыёстанцыі [illegible]

Менск, друкарня [illegible]

„СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ УКЛАД З'ЯУЛЯЕЦЦА БЕЗРАЗДЗЕЛЬНА ПАНУЮЧАЙ АДЗІНА КАМАНДУЮЧАЙ СІЛАЙ ВА УСЕЙ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ" (СТАЛІН)

ПЕРАДАВЫЯ ФАБРЫКІ І ЗАВОДЫ МЕНСКА АДГУКНУЛІСЯ НА ПРАПАНОВУ ЎДАРНІКАЎ ГОМЕЛЯ

ПРАЦАВАЦЬ ПАСТАЛІНСКУ!

Тав. **Сталін** у сваім бліскучым докладзе, які з'яўляецца яркім дакумэнтам, асвятляючым наш шлях барацьбы, рашуча перасцярог ад самакружэння ад поспехаў, ад самазадавальнасьці. Грандыёзныя задачы, якія стаяць перад партыяй, рабочым класам і ўсёй краінай у цяперашняй другой пяцігодцы, патрабуюць упартай работы.

Безмежная адданасць партыі Сталіна-Сталіна, адданасць яе генеральнай лініі найшырэйшых мас працоўных—запрука таго, што гэтыя задачы будуць з гонарам выкананы. Энтузіязм, які ахапіў рабочы клас, калгаснае сялянства і ўсіх працоўных нашай краіны ў сувязі з дакладам тав. Сталіна — **гэта ілюстрацыя гэтай адданасці.**

Прапанова ўдарнікаў перадавых фабрык і заводаў Гомеля аб разгортванні **ўсебеларускай пераклічкі па выкананню плана другога года другой пяцігодкі,** даная ў іх дапісе, змешчаным ва ўчарашнім нумары «Звязды», ужо знайшла водгук на іншых перадавых прадпрыемствах. Заводы **«Большэвік», імя Варашылава** і інш., уключаюцца ў пераклічку, бяруць на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы па выкананню плана другога года другой пяцігодкі, па далейшаму большэвіцкаму развароту магутнай соцыялістычнай прамысловасці.

Мы чакаем, што ў пераклічку **уключацца дзесяткі і сотні фабрык і заводаў, дэпо і майстэрняў,** прамысловых арцеляй, саўгасаў і калгасаў. Навучальныя ўстановы, клубы, дамы соцкультуры таксама павінны **ўключыцца ў гэтую пераклічку — спаборніцтва на большэвіцкае выкананне плана другога года другой пяцігодкі.**

Канкрэтнасць і дзейснасць, большэвіцкая ўдарная работа па выкананню ўзятых самаабавязацельстваў, штодзённая і штогадзінная самаправерка выканання — вось што патрабуецца ад кожнага, хто ўключаецца ў пераклічку. **Бязлітосная барацьба з дэкларацыйнасцю, з чэснымі балбатунамі,** якія могуць пагаварыць, але не хочуць і не ўмеюць працаваць закасаўшы рукавы, працаваць так, каб справа рухалася наперад.

Шырока разгорнем соцыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі, вытворчымі брыгадамі на лепшае выкананне ўзятых самаабавязацельстваў.

Наш рабочы клас пролетарыі Захада завуць ударнай брыгадай сусветнага пролетарыята. Для таго, каб апраўдаць гэту ганаровую назву — гаворыць тав. **Сталін,** — мы павінны **«працаваць лепш і змагацца лепш за канчатковую перамогу соцыялізма ў нашай краіне, за перамогу соцыялізма ва ўсіх краінах». За работу, паболшэвіцку, пасталінску!**

Большэвіцкае слова варашылаўцаў

У сваім лісце тав. **Сталіну,** змешчаным у «Звязде» 30 студзеня, рабочы калектыў чырвонасцяжнага завода **імя Варашылава** рапартаваў XVII з'езду партыі і любаму правадыру сусветнага пролетарыята аб перавыкананні прамфінплана першага года другой пяцігодкі, аб радзе велізарных вытворчых поспехаў, атрыманых заводам. Прапанову даклада тав. **Сталіна** выклікала сярод варашылаўцаў новы магутны ўздым вытворчага энтузіязму, новы прыліў творчай энергіі.

Большэвікі, комсамольцы, увесь рабочы калектыў завода **ўключыліся ва ўсебеларускую пераклічку па выкананню плана другога года другой большэвіцкай пяцігодкі, уступіўшы ў соцыялістычнае спаборніцтва з заводам «Большэвік».**

Тав. **Сталін** у сваім дакладзе заявіў:

«Наша знешняя палітыка ясна. Яна ёсць палітыка захавання міру і ўзмацнення гандлёвых адносін з усімі краінамі... Мы павінны разам з тым прыняць усе меры к таму, каб абараніць нашу краіну ад нечаканасцей і быць гатовымі к яе абароне ад нападу». Варашылаўцы абавязаліся да XVI гадавіны Чырвонай арміі **падрыхтаваць 150 варашылаўскіх стралкоў, а к 1 мая — 300, абсталяваць прыкладны ваенны куток, набыць планер і разгарнуць работу планернага гурткa, рэгулярна праводзіць замяткі СПА.**

Тав. **Сталін** прапанаваў:

«Дабіцца сістэматычнага росту прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту і ўкаранення гаспадарчага разрахунку».

Варашылаўцы абавязаліся **поўнасцю выканаць план другога года другой пяцігодкі па ўсіх показальніках, к 1 маю дабіцца здачы 50 проц. рабочымі завода соцэкзамена.**

Тав. **Сталін** прапанаваў:

«Палепшыць якасць выпускаемых тавараў, спыніць выпуск не камплектнай прадукцыі і карэнным чынам ліквідаваць шкадлівасць цацкай прадукцыі і асабліва якасць запасных частак для трактароў, каб на віне нашага завода не было ні адной мінуты прастою трактароў на соцыялістычных палях, ліквідаваць тэхнічную неграмотнасць сярод усіх некваліфікаваных і малакваліфікаваных рабочых завода, выканаць датэрмінова промфінплан 1934 года.

Мы ўпэўнены, што ўсебеларуская пераклічка з'явіцца найлепшым кантролем у выкананні промфінплана і металам для перадачы вопыту лепшай барацьбы за план 1934 года, за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства ў другой пяцігодцы.

Комунараўцы пастанавілі распрацаваць пісьмо ўдарнікаў перадавых фабрык і заводаў Гомеля ва ўсіх цэхах і зменах і выпрацыраваць канкрэтныя мерапрыемствы.

М. Л.

Комунараўцы ўключыліся ў пераклічку

Рабочыя чырвонасцяжнага завода «Комунар», абгаварыўшы лист рабкораў перадавых фабрык і заводаў Гомеля, пастанавілі ўключыцца ў пераклічку па выкананню плана другога года другой пяцігодкі, шчыра вітаюць ініцыятыву пролетарыяў адзнаго з буйнейшых прамысловых цэнтраў Совецкай краіны — Гомеля.

Завод «Комунар» пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Беларусі і Менскім гаркомам КП(б)Б, закончыў промфінплан 1933 г. на 100 проц., яшчэ да 20 снежня, а з 1 студзеня 1934 г. перавыканаў гадавую праграму на 4,4 проц. Прадукцыйнасць працы ўзрасла на 14,3 проц., сабекошт знижан на 8,3 проц., зарплата рабочых павялічылася на 10,2 проц. — У 1934 г., у другім годзе другой большэвіцкай пяцігодкі, задача, — заявілі рабочыя-ўдарнікі — яшчэ большая. Нам трэба палепшыць якасць цацкай прадукцыі і асабліва якасць запасных частак для трактароў, каб на віне нашага завода не было ні адной мінуты прастою трактароў на соцыялістычных палях, ліквідаваць тэхнічную неграмотнасць сярод усіх некваліфікаваных і малакваліфікаваных рабочых завода, выканаць датэрмінова промфінплан 1934 года.

Мы ўпэўнены, што ўсебеларуская пераклічка з'явіцца найлепшым кантролем у выкананні промфінплана і металам для перадачы вопыту лепшай барацьбы за план 1934 года, за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства ў другой пяцігодцы.

Комунараўцы пастанавілі распрацаваць пісьмо ўдарнікаў перадавых фабрык і заводаў Гомеля ва ўсіх цэхах і зменах і выпрацыраваць канкрэтныя мерапрыемствы.

М. Л.

Уключаемся ў пераклічку

Спіртаводачны завод уключаецца ў ўсебеларускую пераклічку па выкананню плана другога года другой пяцігодкі. Сёння на мітынгу рабочых, у цэхах і брыгадах абмяркоўваем прапанову даклада тав. Сталіна і адначасова прапанову листа ўдарнікаў перадавых прадпрыемстваў Гомеля і вызначаем канкрэтныя самаабавязацельствы.

Выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва па лепшаму выкананню плана другога года другой пяцігодкі гомельскі спіртаводачны завод.

Сакратар парткалектыва **МАРГОЛІН.**
Дырэктар **ПІКУС.**
Старшыня заўкома **БАЦВІНІК.**

ПЛАН УСЕБЕЛАРУСКАЙ РАДЫЁНАРАДЫ ПАРТОРГАЎ І ГРУППАРТАГІТАТАРАЎ

па пытанню аб вопыце папулярызацыі рашэнняў XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б)

На нарадзе выступаюць:

АД МЕНСКА: группартагітатар завода імя Варашылава і парторг абутковай фабрыкі імя Кагановіча.

АД ВІЦЕБСКА: парторг завода «Чырвоны металіст» і группартагітатар швэйнай фабрыкі «Профінтэрн».

АД ГОМЕЛЯ: группартагітатар завода імя Ланцуцкага.

АД МАГІЛЕВА: парторг шаўковай фабрыкі імя Куйбышэва.

АД БАРЫСАВА: парторг завода «Комунар».

Перадачу правесці 7-га лютага 1934 года з 19 гадз. 30 мін. да 21 гадз. 20 мін.

РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ»,
КАМІТЭТ РАДЫЁВЯЩЧАННЯ.

Указанні любімага правадыра натхняюць нас

БЕЛДРЭС, 30. (Па тэлеграфу ад нашых карэспандэнтаў).

Вялікім уздымам сустрэў калектыў Белдрэса адкрытцё XVII з'езда і даклад тав. **Сталіна.** Сёння пасля работы ў галоўным корпусе адбыўся многалюдны мітынг. Пры сустрэчала больш **500** чал. Уздымам творчага энтузіязма віталі рабочыя даклад тав. Сталіна — вялікага правадыра, геніяльнага кіраўніка пістарычных перамог соцыялізма.

— Указанні тав. **Сталіна**—заявілі рабочыя, — памогуць нам перамагчы ўсе труднасці ў пабудове бясклассавага грамадства. Наш лозунг — працаваць так, як тав. Сталін. Даклад правадыра натхняе нас на яшчэ больш упартую барацьбу за пабудову соцыялізма. Калектыў БелДРЭС у адказ на даклад тав. **Сталіна** ўзяў на сябе самаабавязацельствы: ні аднаго перабою ў падачы энергіі на віне станцыі, скончыць замест 2-га ў 1-м квартале ўстаноўку новага трансфарматара на 420 кіло ват, к 15 лютага спрацуецца праз соцтэхэкзамен **250** чалавек.

Рабочыя пастанавілі прапрацаваць даклад тав. **Сталіна** ў школах, гуртках. На мітынгах разгарнулася выклікі брыгад рабочых і ІТР па соцспаборніцтву на лепшыя показальнікі выканання промфінплана.

БУТОМАЎ, ВОЛЬФ.

Адказ гомельскіх чыгуначнікаў на даклад т. Сталіна

ГОМЕЛЬ, 30. (Па тэлефону ад наш. кар.).

Чыгуначнікі Гомеля новай хваляй вытворчага энтузіязма сустрэлі справаздачны даклад тав. Сталіна на 17 з'ездзе ВКП(б). Даклад чытаецца цэлымі групамі рабочых у зменах і брыгадах.

Рабочыя вагоннага дэпо завяраюць правадыра сусветнага пролетарыята, што з патрэбнай энергіяй будуць змагацца за рэалізацыю рашэнняў партыі аб транспарце і яго ўказаннях.

У сувязі з дакладам тав. **Сталіна** ў дэпо шырока разгарнулася праверка выканання абавязацельстваў, узятых к 17-му з'езду.

Дэпо закончыла студзеньскую праграму да 25-га. Выпушчана з сярэдняга рамонта **160** вагонаў супроць плаваных **150.** У гонар з'езда выпушчана з рамонта звыш плана 10 вагонаў і створан соцыялістычны фонд імя Сталіна на **1648** р. 83 к. Механічны цэх выпусціў звыш плана прадукцыі на **685** руб., цэх сярэдняга рамонта—на **450** руб. Работніцы, працуючыя на ўборцы вагонаў, сабралі ў соцыялістычны фонд **104** р. Праз рэвізію букс прапушчаны **2162** вагоны, супроць **2.000** па плану.

Лепшыя ўдарнікі на аснове шырока разгорнутага соцспаборніцтва выканалі свае абавязацельствы. У іх радах ідуць: **Сталярчук Нікалай,** выпускаючы вагоны высокай якасці, рамонта; комсамольская брыгада Кавалёва, якая працуе на сталярных работах, не мае браку ў рабоце. Гэта брыгада выпусціла ў гонар з'езда два вагоны звыш плана. Каваль **Сазенкоў** у падарунак з'езду выпусціў тысячу балтоў супроць задання ў 200, змазчык Лашчэнка, на працягу 10 месяцаў не меў ні адной адчэпкі.

Следам за імі ідуць лепшыя брыгадзіры і ўдарнікі **Мельнікаў, Андрэевіч, Мікосенка, Лысенка, Хірсацаў, Жукаў, Бандарэнка і інш.**

Ударнікі паравознага дэпо ў адказ на даклад рулявога краіны Совецкаў высунулі прапанову прадоўжыць вытворчы паход імя 17-га партз'езда да 1 мая гэтага года і прадоўжыць спаборніцтва з дэпо Віцебск і дэпо Сноўск.

Паравознікі на справе выканалі свае абавязацельствы к 17 партз'езду. План пад'ёмкі паравозаў перавыканан. 24 студзеня старое дэпо рапартавала аб выпуску дзевятага паравоза замест васьмі за месяц.

Процант хворых паравозаў у снежні пры заданні ў **14,53** выканан на **13,1;** за 22 дні студзеня заданне — **14,57,** выканана— **11,3.**

Сярэднясутачны прабег пасажырскіх вагонаў: на студзень было зада на 283 кілометры, выканана 313, па таварных заданне 194,4, выканана **195** кілометраў.

Недадачы паравозаў пад паязды ў снежні і студзені не было.

У фонд імя Сталіна рабочыя дэпо ўнеслі зароблены грошы за выпуск звыш плановых 6 паравозаў з гарачай прамыўкі, аднаго з абточкі і 3-х паравозаў, адрамантаваных аўтаматнай брыгадай. Рабочыя моцных токаў адрамантавалі рэастат, маторы і абсталявалі электрасвятленне паравоза С-165.

Выкананнем і перавыкананнем планаў, канкрэтнымі самаабавязацельствамі, гатоўнасцю пад кіраўніцтвам партыі змагацца за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства адказваюць чыгуначнікі Гомеля тав. Сталіну.

ГАСМАН.

Падцягнуць адстаючыя ўчасткі

ВІЦЕБСК, 30. (Па тэлефону).

Тав. **Сталін** у сваім дакладзе паставіў перад усёй краінай задачу выцягнуць чыгуначны транспарт з вузкага месца. Гэта ў першую чаргу кладзе на чыгуначнікаў вялікую адказнасць. Вось чаму лепшыя ўдарнікі адказалі тав. Сталіну новымі канкрэтнымі самаабавязацельствамі па ўзнаўленню транспарта, яшчэ больш узнімаюць сцяг ленінскага соцспаборніцтва.

Віцебскі чыгуначны раён спаборнічаў з Маскоўскім і Ленінградскім раёнамі на лепшую падрыхтоўку к 17 з'езду ВКП(б). Зараз ужо можна падвесці некаторыя тэматычныя вынікі гэтага спаборніцтва.

Асабліва вызначаецца вагонная майстэрня, сапраўды работыпоўшчыку сустрэўшая 17 з'езд. Майстэрня да тэрміну выканала ступеньскую вытворчую праграму па рамонту вагонаў. Апрача таго, у падарунак з'езду выпушчана звыш плана 12 вагонаў з трацяга рамонта.

План пагрузкі па раёну, які ўвесь час не выконваўся, у рэзультаце падрыхтоўкі да з'езда перавыкананы на 2162 вагоны, супроць 2.000 па плану.

Лепшыя ўдарнікі на аснове шырока разгорнутага соцспаборніцтва выканалі свае абавязацельствы. У іх радах ідуць: **Сталярчук Нікалай,** выпускаючы вагоны высокай якасці, рамонта; комсамольская брыгада Кавалёва, якая працуе на сталярных работах, не мае браку ў рабоце. Гэта брыгада выпусціла ў гонар з'езда два вагоны звыш плана. Каваль **Сазенкоў** у падарунак з'езду выпусціў тысячу балтоў супроць задання ў 200, змазчык Лашчэнка, на працягу 10 месяцаў не меў ні адной адчэпкі.

Следам за імі ідуць лепшыя брыгадзіры і ўдарнікі **Мельнікаў, Андрэевіч, Мікосенка, Лысенка, Хірсацаў, Жукаў, Бандарэнка і інш.**

Ударнікі паравознага дэпо ў адказ на даклад рулявога краіны Совецкаў высунулі прапанову прадоўжыць вытворчы паход імя 17-га партз'езда да 1 мая гэтага года і прадоўжыць спаборніцтва з дэпо Віцебск і дэпо Сноўск.

Паравознікі на справе выканалі свае абавязацельствы к 17 партз'езду. План пад'ёмкі паравозаў перапушчаны ў студзені перавыкананы процантаў на 20. Павялічыўся час прастою вагонаў супроць задання, павысіўся процант замацавання спаранай якасці.

За час падрыхтоўкі к з'езду вызначыліся сваімі соцыялістычнымі адносінамі да працы дзесяткі і сотні лепшых участкаў, брыгад і асобных ударнікаў. Так, брыгады машыністаў Сапрынскага і Старавойтава перавыканалі норму прабегу на 110 проц., далі 25 проц. эканоміі апалу, здалі тэхэкзамен на «добра» і «выдатна».

Брыгада капельшчыкаў Тімафеева зусім ліквідавала паўторнасць рамонта і т. д.

Лепшыя ўдарнікі ўсвядомілі значэнне сталінскіх указанняў аб дапамозе адстаючым і барацьбе за агульны ўзлёт і дабіліся значных поспехаў у гэтай справе. Малатабоец вагоннага дэпо Сцепанаў лічыўся дрэнным работнікам, меў раз спагнанняў, за парушэнні працоўнай дысцыпліны. Лепшы ўдарнік сталінскага прызыву, член партыі тав. Бык узяў Сцепанава пад свой нагляд. У рэзультаце індывідуальнай работы пад ім і дапамогі Сцепанаў стаў вельмі добра адносіцца да працы, выканаў узятыя абавязацельствы к 17 з'езду партыі.

Наогул па ратэе ўчасткаў работы чыгуначнага раёна ёсць бясспрэчныя зрухі, якія з'яўляюцца вынікам большэвіцкай падрыхтоўкі да з'езда. Але ёсць яшчэ і такія ўчасткі, дзе падрыхтоўка не ўнесла колькі-небудзь сур'ёзнага паляпшэння. Гэта адносіцца да службы эксплаатацыі, па віне якой выключна дрэнна выконваецца графік слесавання паязноў на раскладу віцебскага паравознага дэпо, дзе процант хворых паравозаў вольных высокі. Гэта адносіцца да вагоннага ўчастка, па віне якога вялікі процант адчэпак па гарэнню буксаў.

Справа гонару партыйнай арганізацыі, усяго рабочага калектыва Віцебскага чыгуначнага раёна за перыяд работы 17 партз'езда пацягнуць адстаючыя ўчасткі, разгарнуць большэвіцкую работу па выкананню ўзятых зараз самаабавязацельстваў, каб выйсці пераможцамі ў спаборніцтве за большэвіцкую работу транспарта.

Брыгада «Звязды»: Р. ПОЛЗІН.
Г. СЕМАШКА.

Настаўнікі, вучні Менска адабраюць даклад правадыра

З вялікім энтузіязмам сустрэлі настаўніцкія калектывы і вучні менскіх нізэйшых і сярэдніх школ даклад мудрага правадыра нашай партыі і сусветнага пролетарыята тав. **Сталіна.** У навучальных установах г. Менска ўчора адбыліся мітынгі, на якіх настаўнікі і вучні з вялікім задавальненнем сустрэлі даклад тав. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б).

Калектыў менскага **Белпедтэхнікума** на сваім мітынгу, дзе прысутнічалі ўсе 100 проц. студэнтаў і настаўнікаў, адабраючы даклад тав. Сталіна, у сваёй рэзалюцыі абавязаліся яшчэ больш **узняць ударніцтва,** значна павялічыць колькасць ударнікаў, узняць на недасяжную вышыню якасць акадэмічнай і грамадскай работы і стаць у першыя рады ва ўсесаюзным спаборніцтве ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў. Пастанавілі рашэнні з'езда прапрацаваць на палітгуртках.

СТЫРНЭ, АНЦІПЕНКА

НЕАДКЛАДНА ЗАКОНЧЫЦЬ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ

Па 25 студзеня г. г. план ільназагатовак па БССР выканан усяго на 4 проц. На 25 студзеня 1933 г. план ільназагатовак па рэспубліцы быў выканан на 79,3 проц. Гэта значыць, што ў ходзе ільназагатовак у гэтым годзе мы прадаўжаем быць адарваны ад мінулага года. Гэта значыць, што рад раённых партыйных і савецкіх арганізацый БССР нічаму не навучыліся, не ўлічылі ўрокаў ільназагатовак мінулага года, не зразумелі новай абстаноўкі і новых умоў работы на вёсцы. Асобныя кіраўнікі лічаць дагаварваюцца да таго, што ганебным адставанні ільназагатовак у іх раёне вінаваты не яны самі, а сяляне.

Менна так тлумачыў ганебнае адставанне ў ільназагатоўках **Плешчыцкага** раёна сакратар Плешчаніцкага райкома КП(б)Б тав. **Паромчык.** Ён даслоўна так і заявіў:

— Зараз у нас план па ільну выкананы на 42 проц. За гэтыя дні мы дагнем да 50 проц. Больш даць мы не можам. Аб нашым становішчы ў раёне ведае Байновіч (Загатовак), падалі мы дакладную запіску аб гэтаму пытанню. Што-ж мы яшчэ маглі зрабіць?

Каментарыі да гэтага яўна непартыйнага адказу і простай арыентацыі на зрыў ільназагатовак у Плешчаніцкім раёне непатрэбны.

Такія-ж адказы характэрны і для многіх адстаючых раёнаў, як **Талачынскі, Дубровенскі, Клімавіцкі, Касцюковіцкі.**

Кіраўніцтва адстаючых раёнаў як не жадае зразумець таго, што іх-жа саміх, а не ў чым іншым, прычыны ганебнага адставання ільназагатовак. Тав. **СТАЛІН** па адрасе такіх кіраўнікоў у сваёй прамове «аб [illegible] на вёсцы, яшчэ ў мінулым годзе, сказаў наступнае:

«Не ў сялянах патрэбна шукаць прычыну труднасцей у хлебазагатоўках, а ў нас саміх, у нашых уласных радах. Бо мы стаім ва ўладзе, мы маем сродкі дзяржавы, мы закліканы кіраваць калгасамі і мы павінны несці ўсю паўнату адказнасці за работу на вёсцы».

Гэтага ні на мінуту нельга забываць комуністам, калі яны жадаюць быць сапраўднымі кіраўнікамі.

13 студзеня ЦК ВКП(б) і СНК СССР у тэлеграме за подпісамі т. т. **Сталіна і Молатава** на імя т. т. **Гікало і Гападзеда** абавязвалі нас «скарыстаць праходзячыя партканферэнцыі для максімальнай мабілізацыі вясковых арганізацый на выкананне ўсяго гадавога плана ільназагатовак у найкарацейшы тэрмін».

У выкананне гэтай тэлеграмы ЦК КП(б)Б і СНК БССР у той-жа дзень прапанавалі райкампартам, райвыканкомам і нач. палітаддзелам «накіраваць увесь лепшы актыў раёна ў калгасы, сельсоветы, неадкладна прыняць самыя рашучыя дадатковыя канкрэтныя меры для ўзмацнення ільназагатовак па кожнаму сельсовету, калгасу — разгарнуць буксір, узаемадапамогу адстаючым, зламаць кулацкі сабатаж, прыцягнуць да суровай адказнасці комуністаў і комсамольцаў, якія сваёй дрэннай работай зрываюць планы ільназагатовак».

ЦК КП(б)Б назаўтра, г. зн. 14 студзеня, правярае па тэлефону выкананне раённымі гэтага зусім выразнага і канкрэтнага ўказання партыі і ўрада.

Вось, **што паказала праверка адстаючых раёнаў:**

У Клімавіцкім раёне абмежаваліся тым, што «выслалі пастанову, у якой моцна запісалі». Але пасля гэтага-ж «моцна запісанага» рашэння п. старшыня і сакратар райвыканкома — **Буякоў і Варончанка** — астаюцца ў горадзе, сакратар райкома т. **Алай** адразу-ж з пасяджэння прыяжджае ў Менск. Адным словам, мінулае кіраўніцтва раёна (Алай, Буякоў, Берговін, Андросін) абмяжоўвалася канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва, гастралёрскімі наездамі ў сельсоветы, ліберальнічала з тымі работнікамі, якія сабатавалі канкрэтна практычную работу ў сельсоветах і калгасах. Гэтыя апартуністы праяўлялі гніла-ліберальныя адносіны да кулацкіх сабатажнікаў ільназагатовак, чым фактычна дапамагалі сабатажу. Не дзіўна пасля гэтага, што Клімавіцкі раён на 25 студзеня выканаў план ільназагатовак толькі на 37,2 проц. і заняў адно з першых месц у рэспубліцы па адставанню.

Былы сакратар Лёзненскага райкома КП(б)Б тав. **Міцькоў** абмежаваўся тым, што «ўказанне ЦК і СНК па пытаннях ільназагатовак спусціў да сельсоветаў», а сам астаўся сядзець у раённым цэнтры, чакаючы прыезду новавыбранага сакратара РК тав. **Дзеніскевіча.** У гэтым годзе Лёзненскі раён здае ільнавалакно толькі нумарам 6—6,5 замест 10 паводле задання. Колькасны план выканан усяго на 73,6 проц. І вось гэта ганебнае становішча з ільназагатоўкамі ў раёне тав. Міцькоў меў смеласць аб'яснець «дрэнным ураджаем ільну», забываючы, што якасцю работы кіраўніцтва раёна вызначаюцца і якасныя рэзультаты ўраджаю. Мінулае кіраўніцтва Лёзненскага раёна на чале з тав. Міцьковым выносіла пастановы, у якіх «моцна запісвала», але свае рашэнні не падмацоўвала большэвіцкім стылем работы, не жадала ўваходзіць ва ўсе дробязі і дэталі канкрэтнай і практычнай работы на вёсцы. Адным словам, лічылі, што дастаткова даць добрую дырэктыву і справа скончана, а на сутнасці та кая, з дазволу сказаць, работа ператваралася «ў маханне рукамі» **(Сталін).**

Тое, што вынікі работы акрэсліваюцца якасцю арганізацыйна-практычнага кіраўніцтва, пацвярджаецца ў тым-жа Лёзненскім раёне на прыкладзе работы палітаддзела Лёзненскай МТС. Большэвікі-палітаддзельцы працавалі так, што ўваходзілі ва ўсе дробязі і дэталі калгаснай вытворчасці і калгаснага жыцця, арганізоўвалі барацьбу за лён непасрэдна ў калгасных брыгадзе, працавалі на мяльна-сушыльных пунктах і ў выніку гэтага забяспечылі поўнае выкананне плана ільназагатовак калгасамі Лёзненскай МТС.

Тое, што якасць арганізацыйна-практычнага кіраўніцтва вызначае рэзультаты пацвярджаецца таксама на прыкладзе **Сенненскага, Полацкага і Дрысенскага** раёнаў, якія з адстаючых у мінулым годзе сталі перадавымі па выніках і показальніках гэтага года.

Тое, што поспех ільназагатовак цалкам залежыць ад якасці работы партарганізацыі пацвярджае яшчэ і такі прыклад.

Сіроцінскі раён да студзеня ганебна адставаў па ільну толькі таму, што раённае кіраўніцтва набольшэвіцку не займалася ільназагатоўкамі. У студзені ў гэты раён прыбыла буксірная брыгада з лепшых барацьбітоў за лён—дрысенскіх калгаснікаў-ударнікаў на чале з начпалітаддзела тав. **Плаўнікам.** Брыгада павяла барацьбу за ільназагатоўкі не рэзалюцыямі і не нарадамі, а асабістым прыкладам, самаадданай работай непасрэдна ў калгасе на мяльна-сушыльным пункце. Адразу-ж тэмпы ільназагатовак рэзка ўзраслі. І на сёння калгасы Сіроцінскага раёна план ільназагатовак ужо выканалі, а раён у цэлым набліжаецца да стопроцантнага выканання плана.

Стала быць, справа не ў аб'ектыўных прычынах, па якія скардзіцца кіраўніцтва адстаючых раёнаў, а справа ва ўменні і ў жаданні сапраўды па аператыўнаму, паболшэвіцку, іменна так, як вучыць тав. **Сталін,** іменна так, як указваюць тэзісы к дакладу тав. Кагановіча на XVII з'ездзе ВКП(б),—арганізаваць барацьбу за завяршэнне плана ільназагатовак.

У **Расонскім** раёне пасля атрымання тэлеграмы т. т. **Гікало і Гападзеда** барацьба за лён не ўзмацнілася, а нават аслабла. З 5 па 15 студзеня тут паступіла 4,4 проц. гадавога плана, а з 15 па 25 паступіла 3,8 проц. (г. зн. яшчэ менш).

Сакратар Расонскага райкома КП(б)Б тав. **Чумакоў** у той-жа дзень, калі ў раёне была атрымана тэлеграма ЦК і СНК, выехаў у Менск, старшыня райвыканкома тав. Партноў не ўзмацніў практычную работу па ільназагатоўках. Гэты-ж старшыня прабуе аб'яснець адставанне ў ільназагатоўках «недасевам ільну», а аб тым, што вясной яны «рапартавалі» аб поўным выкананні пасеўнага плана, аб гэтым яны сёння ўжо не помняць.

Гэта адносіцца і да такіх раёнаў, як **Мсціслаўскі, Чэвускі, Касцюковіцкі, Чырвонапольскі,** якія выканалі яшчэ менш 70 проц. гадавога плана ільназагатовак.

Ход выканання плана па такіх раёнах, як **Камарынскі** (36,4 проц.), **Прапойскі** (44,6 проц.), **Лоеўскі** (42,7 проц.), **Нараўлянскі** (47,8 проц.) паказвае, што кіраўніцтва гэтых неільнаводчых раёнаў аб ільназагатоўках нават і не думае. Тут «людзі палічылі, што іх абавязкі канчаюцца на выкананні хлебапаставак, а там далей—хоць трава не расці».

У выніку гэтага па пералічаных раёнах за апошнія пяціднеўкі ільназагатоўкі амаль спыніліся. Гэта не можа не сказвацца на показальніках ільназагатовак па ўсёй рэспубліцы. Прырост з 5 да 10 студзеня складаў 3,8 проц., з 10 па 15—2,1 проц., з 15 па 20—1,9 і з 20-га па 25-е—2 проц. і то толькі таму, што Загатлён затрымаў на 2 дні зводкі свядома для таго, каб паказаць у іх прырост не менш чым за папярэднюю пяціднеўку. Гэтыя показальнікі гавораць аб тым, што далей нельга цярпець ні мінуты такога ганебнага адставання ільназагатовак.

У нас ёсць усе магчымасці выканаць план у найкарацейшы тэрмін. Патрэбна толькі сапраўды пабольшэвіцку арганізаваць зараз на мясцах практычную работу па завяршэнню плана ільназагатовак. Патрэбна толькі скарыстаць усе стымулы і льготы, прадстаўленыя партыяй і ўрадам для забеспячэння поўнага выканання загатовак ільну. Патрэбна толькі з большэвіцкай непрымірымасцю даваць самы бязлітасны адпор якім-бы там ні было спробам сабатажу і нежадання арганізаваць работу так, каб забяспечыць 100 проц. выкананне плана ільназагатовак па кожнаму сектару, сельсовету і раёну.

У перыяд партыйных канферэнцый, калі лепшыя партыйныя сілы былі адцягнуты на мясцах на складанне справаздач, падрыхтоўку рэзалюцый і другіх пытанняў, звязаных з перавыбарамі,—у раёнах наглядалася аслабленне барацьбы за лён, асабліва гэта адчувалася ў адстаючых раёнах, партарганізацыі якіх не здолелі скарыстаць праходзіўшыя партканферэнцыі для максімальнай мабілізацыі ўсіх сваіх лепшых сіл на выкананне ўсяго гадавога плана ільназагатовак у найкарацейшы тэрмін. Гэта значыць, што адстаючыя раёны не ўспрынялі па большэвіцку тэлеграму т. т. **Сталіна і Молатава,** зрываючы тым самым выкананне апошніх указанняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па пытанню загатовак ільну.

Зразумела, што надалей такую работу кіраўніцтва адстаючых раёнаў цярпець нельга.

Лозунг кіраўніка КП(б)Б тав. **Гікало,** на чале з якім наша беларуская партарганізацыя за апошні год дабілася буйнейшых поспехаў у соцыялістычным будаўніцтве, кінуты ім на XV з'ездзе КП(б)Б аб тым, каб у бліжэйшы перыяд зрабіць сельскую гаспадарку БССР перадавой у Совецкім Саюзе, гэты лозунг патрабуе ад кожнай партарганізацыі і кожнага комуніста работы сапраўды пановаму.

Нельга забываць таго, што заняцце ільназагатовак б'е, зараз у першую чаргу на падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі. І тыя раённыя арганізацыі, якія замест барацьбы за лён прадаўжаюць яшчэ займацца апартуністычнымі разважаннямі аб немагчымасці выканання плана, зрываюць тым самым практычнае ажыццяўленне лозунга тав. **Гікало**—зрабіць нашу рэспубліку перадавой у Саюзе па ўсіх показальніках.

XVII з'езд ВКП(б), толькі што апублікаваны даклад правадыра нашай партыі т. Сталіна мы павінны адзначыць самай упартай і сапраўды большэвіцкай барацьбой за лён. «Партыйны з'езд павінен праходзіць у атмасферы самай энергічнай, самай ударнай, дзелавой работы на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, на ўсіх раёнах і кутках нашай вялікай краіны. Гэта абавязак, гэта пытанне гонару кожнага большэвіка» («Правда»).

СУСВЕТНЫ ДРУК АБ ДАКЛАДЗЕ ТАВ. СТАЛІНА

КІТАЙ

БЕЙПІН, 30 студзеня (Белта).

Даклад тав. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б) займае цэнтральнае месца ва ўсім цэнтральным друку Бейпіна і Тянь-Цзіна.

Даклад публікуецца пад загалоўкамі: «Сталін у вялікім дакладзе аб сусветным становішчы робіць перасцярогу падпальшчыкам вайны», «Сталін заяўляе, што СССР нікому не пагражае, але нікога не баіцца».

Заява Сталіна, што «ў наш час са слабымі не прынята лічыцца, лічацца толькі з моцнымі» прыцягнула асаблівую ўвагу і многія газеты скарыстоўваюць яе ў відзе падзагалоўка.

Спыняючыся на гэтых словах Сталіна, «Дагунбао» піша:

«Кітай павінен звярнуць найвялікшую ўвагу на выдатнейшае ўказанне Сталіна, каб не аказацца ў ролі ахвяры надыходзячай вайны. Шчыра захапляючыся прамалінейнай заявай Сталіна і іншых совецкіх дзяржаўных дзеячоў, мы павінны паставіць пытанне, што дало ім магчымасць гаварыць сёння такой гордай і выразнай мовай.

Натуральна, што гэту магчымасць дало ім паспяховае завяршэнне першай пяцігодкі, умацаванне абароны краіны і ўзмацнение Чырвонай арміі».

«Цзінбао» заяўляе, што ў дакладзе правадыра СССР Сталіна выяўляецца мужнасць і сіла волі, якія могуць быць уласцівы толькі сапраўднаму правадыру. 10 год назад, паводле слоў тазеты, СССР яшчэ не прадстаўляў той карціны, як сёння. Сёння краіна поўна жыцця і сіл, прамысловасць і сельская гаспадарка быстра прагрэсуюць, кожны мае работу і хлеб. Тыя, хто раней глядзелі на СССР зверху ўніз, дабіваюцца збліжэння з ім, тыя, хто трымаўся ад яго ў баку, дабіваюцца аднаўлення адносін.

— Натуральна, — прадаўжае газета, — што ў гэтых умовах Сталін выказвае свае многазначныя мысліі з такім вялікім уздымам.

— Калі СССР са свайго раней шага становішча перайшоў на становішча першаступеннай дзяржавы і адыгрывае выдатнейшую ролю на міжнароднай арэне, — піша газета, — калі першая пяцігодка паспяхова завершана, калі ў галіне совецкай знешняй палітыкі, асабліва ў 1932-33 г.г. атрыманы перамогі, — то ўсё гэта дасягнута Совецкім Саюзам выключна пад кіраўніцтвам Сталіна, кіраўніцтвам, выходзячым з цвёрдых планаў і мер, а галоўнае — з няўхільнай волі да работы і барацьбы.

Газета ў прыватнасці звяртае ўвагу на палітыку СССР у адносінах Японіі. Якая ўмелая і цвёрдая палітыка, — піша газета. Ёю нельга не захапляцца. Далей газета ўказвае, што заключныя словы знешня-палітычнай часткі даклада Сталіна па сваёй яснасці не могуць быць пераўзойдзенымі.

ІТАЛІЯ

РЫМ, 30 студзеня (БЕЛТА).

Італьянскі друк змясціў паведамленне аб адкрыцці XVII парт з'езда, аб дакладзе Сталіна і аб прамове Молатава.

Газеты выдзяляюць у выступленнях Сталіна і Молатава тыя месцы, якія датычаць праблем міжнароднай палітыкі.

«Лавора фашыста», змясціўшая падрабязнае паведамленне аб дакладзе Сталіна, асабліва спыняецца на пытанні аб совецка-японскіх і совецка-германскіх адносінах.

«Сталін,—піша газета,—ахарактарызаваў становішча на Далёкім Усходзе, як надзвычайна сур'ёзнае. Адмаўленне Японіі ад заключэння пакта аб ненападзе і няўдача совецка-японскіх перагавораў аб продажы КУЧ, стварылі трывожную абстаноўку.

Совецкі Саюз гатоў палепшыць адносіны з Японіяй, але гэта залежыць не толькі ад яго. З прычыны гэтага Сталін указаў на неабходнасць прыняцця тэрміновых мер па абароне СССР з тым, каб забяспечыць Совецкі Саюз ад нападу і ад усякіх нечаканасцяй».

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 30 студзеня (БЕЛТА)

Каментуючы даклад тав. Сталіна на 17 з'ездзе партыі, «Ніці-Ніці» ў перадавым артыкуле заяўляе, што паміж СССР і Японіяй няма ні адной праблемы, вырашэнне якой было-б магчыма толькі пры дапамозе зброі.

Газета мяркуе, што асноўная перашкода ў справе ўстанаўлення сапраўды прыязных адносін паміж СССР і Японіяй заключаецца ў гутарках аб вайне супроць СССР, якія маюць месца ў Японіі і якія выклікаюць у СССР трывогу.

Газета лічыць таму, што калі Японія сапраўды жадае паляпшэння адносін з Совецкім Саюзам, японскі ўрад павінен правільна «наладзіць тон грамадскай думкі Японіі».

У заключэнне газета ўказвае, што Хірота праў, заўважаючы, што ўрэгуляванне совецка-японскіх адносін «катэгарычна неабходна для міру ва Ўсходняй Азіі».

Газета лічыць, што гэтая акалічнасць павінна быць улічана абодвума краінамі.

ДАНІЯ

СТАКГОЛЬМ, 30 студзеня (БЕЛТА).

Дацкі друк публікуе на відным месцы падрабязныя вытрымкі з даклада Сталіна, асабліва выдзяляючы частку аб міжнародным становішчы.

Некаторыя часткі даклада, як напрыклад, часткі, якія датычаць мірнай палітыкі СССР і словы аб «расавай тэорыі», перадаюцца жырным шрыфтам.

Афіцыёз «Політікен» адзначае, што даклад Сталіна выклікаў водгукі ва ўсім свеце. Падкрэсліваючы тыя часткі даклада, дзе гаворыцца аб пагрозах вайны, газета піша, што «усё сігналізуе вайну».

Падрабязнымі каментарыямі суправаджаюць даклад Сталіна і іншыя дацкія газеты.

Нарвежскі друк апублікаваў даклад з прычыны надзвычайнага перапынку толькі ў скарочаным размеры.

«Тыдэнс тогн» друкуе жырным шрыфтам частку аб ваеннай пагрозе на Далёкім Усходзе.

НОВЫ ФРАНЦУЗСКІ ГАБІНЕТ

ПАРЫЖ, 30 студзеня (БЕЛТА).

Даладзе сфармаваў урад. У склад урада ўвайшлі згодна парэдніх даных, Фро (непалежыць ні да адной з парламенцкіх груповак)—у якасці міністра ўнутраных спраў; Пётры (член цэнтрысцкай групы «рэспубліканскай левай»)—міністр фінансаў і бюджэту; Фабры (член групы «радыкальнай левай», якая займае прамежкавае становішча паміж радыкаламі і цэнтрам) — ваенны міністр; Кот (радыкал-сацыяліст)—міністр авіяцыі; Шандэлен (член «радыкальнай левай»)—морскі міністр; Жувенель—міністр калоній; Кей (радыкал-сацыяліст) — міністр земляробства і інш.

ФАШЫСЦКАЯ „ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭФОРМА"

БЕРЛІН, 31 студзеня (БЕЛТА).

Новы закон аб «дзяржаўнай рэформе», які карэнным чынам мяняе структуру германскай дзяржавы і прадастаўляе шырокія паўнамоцтвы для яе далейшага змянення, быў прынят рэйхстагам без усякага абмеркавання на працягу 3-х мінут.

Друк адзначае, што старшыня рэйхстага Герынг, не зачытваючы сутнасці закона, здолеў правесці закон «у першым, другім і трэцім чытаннях».

***

БЕРЛІН, 31 студзеня (Белта).

Паводле паведамлення інфармацыйнага бюро рэйхстаг і рэйхстаг «аднагалосна прынялі законапраект» міністра ўнутраных спраў аб змене структуры германскай дзяржавы. Ландтагі скасоўваюцца, усе аўтаномныя правы правінцый перадаюцца цэнтральным уладам. Усе правінцыяльныя ўрады ва ўсіх пытаннях падначалены германскаму ўраду. Назначаныя германскім урадам намеснікі правінцый падначальваюцца германскаму міністру ўнутраных спраў.

МАГУТНЫЯ ПРОЛЕТАРСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 29 студзеня (БЕЛТА).

Не гледзячы на супраціўленне рэфармісцкіх профбюракратаў, адбылася дэманстрацыя 5 тыс. шофераў таксі, праведзеная на аснове адзінага фронта. У Марселі 10 тыс. рабочых дэманстравалі, пратэстуючы супроць арыштаў, праведзеных у часе папярэдняй дэманстрацыі. У Ніцы адбылася агульная дэманстрацыя 8 тыс. рабочых. Сутычкі з паліцыяй прадаўжаліся да позняга вечара. У Тулузе 3 тыс. дэманстрантаў разагналі прадаўцоў фашысцкіх газет і адстралі сакратара акруговага камітэта компартыі супроць спроб паліцыі арыштаваць яго.

У радзе гарадоў адбываліся дэманстрацыі беспрацоўных.

АНГЛІЙСКІ МЕМАРАНДУМ

ПАРЫЖ, 30 студзеня (БЕЛТА).

Англійскі мемарандум аб «разбраенні» перадан міністэрству замежных спраў. Гэты мемарандум становіць новы «кампраміс» паміж германскімі патрабаваннямі аб даўзбраенні і французскай пазіцыяй у гэтым пытанні.

Паводле вестак французскага друку, мемарандум прапануе ўстанавіць не выпрабавальны перыяд, а «пераходны перыяд», у часе яго га Германія атрымае права мець прататыпы ўзбраенняў.

Што датычыць асабістага складу германскай арміі, дык англійскі мемарандум прадугледжвае сярэднюю лічбу паміж 200 тыс. згод на першапачатковага плана Макданальда і 300 тыс., якія патрабуюцца Германіяй.

Нарэшце англійскі мемарандум прапануе ўжываць кантроль над узбраеннямі ўсіх удзельнікаў канвенцыі па «ўзбраенню».

ДАКЛАД АБ СССР У СОРБОНЕ

ПАРЫЖ, 30 студзеня (Белта).

Прафесар Членаў зрабіў у Сорбоне вялікі даклад аб эканамічным становішчы СССР і аб другім пяцігадовым плане. Даклад сабраў вялікую аўдыторыю і неаднаразова выклікаў апладысменты.

„ЗУСІМ НОВЫ СВЕТ"

ПАРЫЖ, 30 студзеня (Белта).

У «Аксіон агрыколь» граф Рамбо, які вярнуўся з СССР, падкрэслівае аграмадныя дасягненні СССР, які з'яўляецца «зусім новым светам».

«Тое, што мы бачылі ў СССР,— піша аўтар, — заслугоўвае выключнай увагі французскага народа. Совецкі Саюз заклікан адыгрываць першаступенную ролю ў сусветнай эканоміцы.

Дасягненні Совецкага ўрада да развіцця сельскай гаспадаркі аграмадныя. Нават параўнальна невялікае павышэнне ўраджайнасці на неабсяжных апрацоўваемых прасторах Совецкага Саюза можа даць сур'ёзныя рэзультаты.

Надзвычайна вялікае ўражанне зрабілі на нас даследчыя інстытуты і шматлікія вопытныя станцыі і асабліва высокая якасць іх работ. Дасягнутыя рэзультаты робяць гонар совецкім вучоным.

Гэтыя рэзультаты вельмі вялікія і ў некаторых адносінах нават сенсацыйныя. Мяркуючы па ўсяму, мы адсталі ад Совецкага Саюза».

Рэчыцкі леспрамгас выканаў студзеньскі план лесавывазкі

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО
СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ
УПАЎНАРКАМЛЕСУ—тав. РОЗІНУ
ЛЕСБЕЛ—тав. ШАПІРО

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б НА ЧАЛЕ З ТАВ. ГІКАЛО НА АСНОВЕ ПРАВЯДЗЕННЯ БОЛЬШЭВІЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ МАСАВАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСНІКАЎ І ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ, ШЫРОКА РАЗГОРНУТАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ, УЗЯТАЕ НАМІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ДАЦЬ У СТУДЗЕНІ НЕ МЕНІШ 40 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ПЛАНА ДРОВАЛЕСАЗАГАТОВАК ПЕРАВЫКАНАНА. ЗАДАНІЕ ПА ВЫВАЗЦЫ БУДАЎНІЧАЙ ДРАЎНІНЫ —146 ТЫС. КУБ. МЕТРАЎ, ВЫВЕЗЕНА НА 29 СТУДЗЕНЯ 59.119 КУБ. МЕТРАЎ, АБО 40,5 ПРОЦ. ЗАДАНІЕ ПА ДРОВАХ—185 ТЫС. КУБ. МЕТРАЎ, ВЫВЕЗЕНА 76.082 КУБ МЕТРАЎ, АБО 41,1 ПРОЦ. ЗМАГАЕМСЯ ЗА ВЫКАНАННЕ КВАРТАЛЬНАГА ПЛАНА ДА 1 САКАВІКА.

ЗА САКРАТАРА РАЙКОМА КП(б)Б СВЯТЛОВІЧ.
СТАРШЫНЯ РВК САЎКОЎ.
ДЫРЭКТАР ЛЕСПРАМГАСА МУЦ.

***

Рэчыцкі леспрамгас—адзін з леспрамгасаў ПАЎДНЁВАГА раёна БССР, выканаў студзеньскае заданне па вывазцы лесу і дроў. Перамога Рэчыцкага леспрамгаса—яркае сведчанне таго, чаго можна дабіцца, калі замест вышукання розных «аб'ектыўных» прычын людзі габольшэвіцку бяруцца за работу, калі замест пустой балбатні кідаюць усе сілы на АРГАНІЗАЦЫЮ перамогі і ПРАВЕРКУ ВЫКАНАННЯ даных дырэктыў.

Адразу-ж пасля вядомай тэлеграмы старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА, у якой ён прапанаваў усім сельсоветам і леспрамгасам «рашуча ўзяцца за выкананне плана лесавывазак і лесазагатовак», Рэчыцкі райком КП(б)Б і райвыканком разгарнулі вялікую работу па мабілізацыі калгасных мас і ад. ніасобнікаў пад лозунгам «ВЫКАНАЕМ СТУДЗЕНЬСКІ ПЛАН ДА XVII З'ЕЗДА ПАРТЫІ». Ва ўсе сельсоветы былі пасланы адказныя работнікі ў якасці ўпаўнаважаных райкома КП(б)Б і РВК. Упаўнаважаныя былі папярэджаны, што яны нясуць такую-ж адказнасць за выкананне плана, як і старшыні сельсоветаў.

При актыўнай дапамозе раённых арганізацый на ўчастках леспрамгаса разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Спаборнічалі калгас з калгасам, сельсавет з сельсоветам. ДЭКАДНЫЯ ЗАДАННІ БЫЛІ РАЗБІТЫ НА ШТОДЗЕННЫЯ І ДАВЕДЗЕНЫ ДА КОЖНАГА СЕЛЬСОВЕТА І КАЛГАСА. Быў арганізаван выразны ЎЛІК выканання штодзённага задання. Комсамольцы лесапунктаў узялі на сябе абавязацельства «штодзённа даваць зводкі ў сельсоветы аб выхадзе на работу адна-асобнікаў і калгаснікаў». Выразны ўлік даў магчымасць аператыўна рэагаваць на поспехі і правывы. Метады рэагавання былі самымі разнастайнымі. Старшыня РВК тав. САЎКОЎ правёў шмат ініцыятывы і энергіі ў гэтай справе. Быў устаноўлен пераходны сцяг РК КП(б)Б і РВК. Сцяг атрымаў перадавы Бабіцкі сельсавет на чале са старшынёй БАРУШКОВЫМ, выканаўшы поўнасцю сваё задание, да адкрыцця XVII парт'езда. Старшыня Дземіхоўскага сельсавета РАЙКЕВІЧ прэміяван у суме 150 рублёў, старшыня калгаса «Май», Вышамірскага сельсавета, тав. СКАРОМНЫ атрымаў прэмію 50 рублёў. У распараджэнне Дземіхоўскага сельсавета і праўлення калгаса «Май» перадана 300 руб. для прэміявання ўдарнікаў. Апрача таго, Бабіцкі, Дземіхоўскі і Нахайскі сельсаветы (старшыня тав. МАРТЫНАЎ) занесены на ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ.

У той-жа час самы адстаючы Сямёнаўскі сельсавет (старшыня ФІДЭЛЬСКІ) атрымаў рагожны пераходны сцяг, старшыня Вышамірскага сельсавета СКАРОМНЫ атрымаў рагожны пераходны партфель, старшыня Хотмецкага сельсавета ЧЭРНЯЎСКІ атрымаў рагожную пераходную шляпу, сем адстаючых сельсоветаў былі занесены на чорную дошку. Старшыні Сямёнаўскага сельсавета Фідэльскаму была абвешчана строгая вымова з папярэджаннем.

Меры заахвочвання лепшых сельсоветаў і калгасаў і рэпрэсіўныя меры супроць адстаючых, сабатуючых дырэктывы партыі і ўрада, далі вельмі добрыя вынікі. Раённыя арганізацыі здолелі мабілізаваць 4.300 фурманак з 9-10 тысяч, у той час, як у суседнім Пятрыкоўскім раёне, напрыклад, які знаходзіцца ў такіх-жа ўмовах, здолелі мабілізаваць толькі 1.500 фурманак з 12-13 тыс.

Такім чынам, дзякуючы канкрэтнаму аператыўнаму кіраўніцтву, штодзённай праверкі выканання, [illegible] метадам заахвочвання перадавых і падцягвання адстаючых,—Рэчыцкі леспрамгас выйшаў на першае месца ў БССР. Трэба яшчэ ўлічыць, што Рэчыцкі леспрамгас з'яўляецца адным з трохчатырох БУЙНЕЙШЫХ леспрамгасаў БССР і па квартальнае заданне па вывазцы складае 331 ТЫС. [illegible] КУБ. Гэта лішні раз гаворыць аб тым, што для прарыву ў вывазцы лесу і дроў сапраўды няма ніякіх «аб'ектыўных» прычын.

Адстаючыя леспрамгасы (а іх яшчэ вельмі многа: Дубровенскі, Быхаўскі, Ушацкі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Крулоскі, Сенненскі, Лельчыцкі, Пятрыкоўскі, Бешанковіцкі, Нараўлянскі, Рагачоўскі і інш.) павінны ўзяць прыклад з Рэчыцкага. Квартальнае задание за 25 дзён студзеня выканана па ЗАГАТОЎЦЫ будаўнічага матэрыяла на 23,7 проц., дроў—на 16,2 проц., па ВЫВАЗЦЫ будаўнічага матэрыяла — на 19.6 проц., дроў — на 22,4 проц. (замест 35-40 проц. па ўсіх паказальніках). Гэтыя лічбы б'юць трывогу. Застаўся фактычна АДЗІН МЕСЯЦ для выканання квартальнага плана. Ад тэмпаў лесавывазкі ў лютым залежыць УСЁ, залежыць снабжэнне новых пабудоў, прамысловасці і ўсёй народнай гаспадаркі лесаматэрыяламі і дровамі. На леспрамгасах, на раённых арганізацыях пяжыць вялікая адказнасць за выкананне плана лесазагатовак і вывазкі.

Р. Б.

Па Совецкай Беларусі

ШАФРАН-КІТАЙКІ, ЖАЛЕЗНАЕ ДРЭВА...

Агульнавядомы вялікія заслугі буйнейшага даследчыка і вучонага Мічурына. У яго актыве каля 300 зусім новых пладовых, гародніх і дэкаратыўных раслін, 25 гатункаў вінаграда, 52 сарты вішань і т. д. і т. д.

Мічурын пераносіць поўдзень на поўнач, рэзультаты яго вопытаў—гэта рэволюцыя ў садаводстве.

Ці можна ўжыць вопыт і мегады Мічурына на Беларусі, і ў прыватнасці на балотных масівах?

Аказваецца, што балоты нашай краіны—удзячная глеба для развіцця садаводства, гароднцтва і мастачкага садабудаўніцтва.

З мічурынскага саду прывезлі цэлы набор сартоў пладовых дрэў — груш «Бэра-победа», розных скрыжаванняў кітайскіх яблынь з крымскімі сартамі яблынь, яблык «Чырвоны штандар».

Пасля некалькіх год выпрабаванняў на менскай балотнай станцыі выявілася, што гэтыя сарты зусім удала развіваюцца на поўбалотнай і балотнай глебах.

У сучасны момант у Менску ёсць ужо цэлы пладовы сад, які выключна складаецца з мічурынскіх сартоў. У ім растуць:

Яблыкі:

«Чырвоны штандар»

Ранет-бергамотны, шафран-кітайкі, бельфлёр-кітайкі.

Грушы:

Сурагат цукру—бэр-победа, бэра зімовая мічурынская.

Вішня пладародная.

Ажына пладаносная.

Дрэвы далёка яшчэ не дасягнулі поўнага росту, але можна сказаць з упэўненасцю, што на балотнай глебе гэтыя сарты дадуць асабліва высокую ўраджайнасць, таксама як з нашых сартоў надзвычай пладаносны яблыні--каробаўка,

Маліна вырашчаная на балотным масіве.

антонаўка і некаторыя другія Вялікую ўраджайнасць дае і маліна на балоце.

Апрача гэтага, па ініцыятыве прафесара Адамава ў дзікай зарасліі побач з запаведнікам Камароўскага балота быў разбіт невялікі паркавы ўчастак, які цяпер вельмі разросся і прадстаўляе добрае месца для рабочага адпачынку.

Тут-жа, на мяжы балота з сасновым лесам, разбіт у ландшафтным стылі батанічны ўчастак, пры значаны для вывучэння рознай расліннасці, дзе можна наглядаць найбольш характэрныя для БССР тыпы сасновага лесу і пераходы да тыпаў балотнай расліннасці.

Відаць, як сасновы бор паступова змяняецца алешнікам і яка травяністая расліннасць суправаджае тую ці іншую асноўную лясную пароду.

На Камароўскім балоце арганізаваны таксама дэндралагічны і вуковы рассаднік, дзе высеяна і засушана каля 200 розных дрэўных і кустарнікавых парод. Ту ёсць апрача дрэў клімату БССР і рад экзатычных парод. Узмоцнена развіваецца персідская пароцыя, або так званае жалезная дрэва, якое паказвае поўную выслівасць ва ўмовах Беларусі.

Добра распе катальпа—дрэва вельмі буйнымі лісцямі і арыгінальнымі кветкамі, якое звычайна разводзіцца толькі ў паўднёвых мясцах.

Ёсць віргінская хурма, яка яшчэ зараз маладое дрэва, але праз некаторы час, судзячы па добраму развіццю, будзе пладаносіць. Хурма—адно з любімых пладовых дрэў нашых субтропікаў.

Дэндралагічны рассаднік прадстаўляе вялікі інтарэс і ў тым сэнсе, што тут побач з трапічнымі породамі дрэў маюцца і пароды паўночных краін — сібірскія кедры, топаль.

Культываванне на балотнай глебе розных дрэўных парод адкрывае вялікія перспектывы для азелянення гарадоў Совецкай Беларусі.

Вопыты балотнага інстытута ў Менску паказваюць, як можна ператварыць нізіны і балоты ў пахучыя сады, поўныя кветак, сакавитых ягад і фруктаў.

М. КІН.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ІНСТЫТУТА ЯЎРЭЙСКАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРЫ УСЕУКРАІНСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК У МЕНСКУ

У Менск прыехала дэлегацыя інстытута яўрэйскай пролетарскай культуры Усеукраінскай Акадэміі Навук. У складзе яе—дырэктар інстытута тав. Ліберберг і навуковыя работнікі інстытута тав. Мармора—адзін з старэйшых членаў амерыканскай компартыі, вядомы гісторык яўрэйскага рэволюцыйнага руху, і тав. Эрык—буйнейшы яўрэйскі літаратуравед.

Мэта прыезда ў Менск—устанавіць больш цесны навуковы кантакт з яўрэйскім інстытутам пролетарскай культуры Акадэміі Навук Беларусі і азнаёміцца з гаспадарчым і культурным будаўніцтвам БССР.

Пры удзеле дэлегацыі адбыліся нарады ў віцэ-прэзідэнта Акадэміі Навук тав. Домбаля, у дырэктара інстытута яўрэйскай пролетарскай культуры тав. Агурскага з яўрэйскімі пісьменнікамі і т. д.

У выніку нарад прыняты рашэнні аб сумесным выданні раду навуковых работ і ў першую чаргу акадэмічнага выдання твораў Віткаўскага, Эдэльштадта і Баўшовера.

Акрамя таго, абодвы інстытуты выпрацавалі план выдання поўнага падручніка па гісторыі яўрэйскай совецкай літаратуры для школ.

Усе гэтыя выданні павінны з'явіцца ў свет на працягу 1934 года.

Акадэмія Навук Беларусі пала дзіла ў клубе імя Леніна вялікі інтэрнацыянальны вечар змычкі удзелам прадстаўнікоў польскага яўрэйскага і літоўскага інстытутаў Акадэміі Навук, яўрэйскіх пісьменнікаў, журналістаў, ударнікаў менскіх прадпрыемстваў. На вечары прысутнічала каля 1.500 чалавек.

Вечар змычкі з'явіўся бліскучай дэманстрацыяй інтэрнацыянальнага адзінства працоўных мас. Газета «Окцябр» прысвяціла прыезд дэлегацыі спецыяльную старонку.

Дэлегацыя азнаёмілася ў Менску з новабудоўлямі, наведала клінічны гарадок, дом Урада і т. д.

ЛІБЕРГБЕРГ

У барацьбе за большэвіцкую навуку

(Аб навукова-даследчым інстытуце яўрэйскай пролетарскай культуры усе украінскай Акадэміі Навук, КІЕЎ).

У складзе Усеукраінскай Акадэміі Навук знаходзіцца побач з другімі навуковымі адзінкамі таксама і Інстытут Яўрэйскай Пролетарскай Культуры. Згуртаваўшы ў сябе вельмі значныя навуковыя сілы, інстытут прадстаўляе сабой буйнейшую яўрэйскую навукова-даследчую ўстанову ва ўсім Саюзе. У сучасны момант у Інстытуце працуе (разам з аспірантамі) каля 90 чалавек, прычым на працягу 1934 года гэты лік, у сувязі з расшырэннем дзейнасці Інстытута, будзе яшчэ больш павялічан і даведзен да 120 чалавек. Партыйна-комсамольская праслойка ў Інстытуце дасягае 30 проц. (20 чал. членаў партыі і 8 членаў КСМ).

Інстытут складаецца з васьмі секцый: 1) гістарычнай, 2) соцыяльна-эканамічнай, 3) педагагічнай, 4) літаратурнай, 5) філалагічнай, 6) этнаграфічнай, 7) бібліялагічнай і 8) секцыі бібліяграфіраведзення. Ужо з самой гэтай комплекснай структуры Інстытута відаць, што ён прадстаўляе сабою вельмі складаную навукова-даследчую арганізацыю, ахапляючую самыя рознастайныя галіны соцыялістычнага і культурнага будаўніцтва сярод яўрэйскіх працоўных мас.

Пры Інстытуце і яго секцыях існуе рад навукова-дапаможных устаноў. У першую чаргу патрэбна адзначыць бібліятэку, якая мае каля 200 тысяч тамоў і якая з'яўляецца па багацці сваіх яўрэйскіх кніжных фондаў другой бібліятэкай у свеце. Дастаткова сказаць, што ў бібліятэцы ёсць амаль уся асноўная літаратура аб яўреях па 25 мовах. Бібліятэка мае таксама багацейшы рукапісны аддзел, у якім налічваецца звыш тысячы рукапісаў, пачынаючы з XIII века.

Другой навукова-дапаможнай установай Інстытута, заслугоўваючай асаблівай увагі, з'яўляецца архіў прэсы, які сабраў найбольш каштоўныя фонды старой і рэволюцыйнай яўрэйскай перыёдыкі. У сучасны момант архіў прэсы атрымлівае сістэматычна яўрэйскую перыёдыку на розных мовах з сарака розных краін (за апошнія тры гады архіў рэгулярна атрымліваў звыш 600 назваў яўрэйскіх журналаў і газет). У архіве збіраецца і старанна прапрацоўваецца яўрэйская комуністычная праса ўсяго свету (СССР, ПАЗШ, Польшча, Латвія, Францыя, Аргентына, Канада, Бразілія, Уругвай і інш.).

Наступнай навукова-дапаможнай арганізацыяй Інстытута з'яўляецца бібліяграфічнае бюро, якое абслугоўвае ўсю навукова-даследчую работу Інстытута. Як асобную заслугу бібліяграфічнага бюро, неабходна адзначыць складанне і апублікаванне ім агульнай бібліяграфіі яўрэйскай совецкай кніжнай прадукцыі за гады 1917-1930 (35 друкав. аркушаў) і раду іншых каштоўных бібліяграфічных работ, як бібліяграфіі Леніна і ленінізма на яўрэйскай мове.

Нараду з вышэйпамянёнымі больш буйнымі навукова-дапаможнымі ўстановамі ў Інстытуце працуе таксама і рад габінетаў і лабараторый (гістарычны архіў, педагагічны габінет, габінет музыкальнага фальклора, архіў славеснага фальклора, габінет совецкай яўрэйскай літаратуры, лінгвістычны габінет і т. д.)

Але асноўным паказальнікам дасягненняў акадэмічнай установы з'яўляецца, зразумела, яго навуковая прадукцыя. Аднак і ў гэтых адносінах Інстытут Яўр. Прол. Культуры, занесены к XVII партз'езду, побач з некаторымі іншымі інстытутамі, у чырвоную кнігу ВУАН, займае ва Усеўкраінскай Акадэміі Навук адно з першых месц.

За некалькі гадоў свайго існавання Інстытут правёў значную навукова-даследчую работу. За апошнія гады Інстытут сістэматычна перагледзеў свае вытворчыя планы. Пры гэтым належыць падкрэсліць выключна актуальную і баявую тэматыку работ Інстытута. Асабліва энергічную дзейнасць развіў інстытут за апошнія 2 гады, пасля гістарычнага пісьма тав. Сталіна, які палажыў пачатак новаму этапу ў барацьбе за маркса-ленінскую навуку.

Не маючы магчымасці ў газетным артыкуле даць падрабязнае апісанне усіх падрыхтаваных да друку і апублікаваных навуковых работ Інстытута, мы абмяжуемся толькі пералікам яго важнейшых выданняў.

Педагагічная секцыя інстытута, якая ставіць сабе сваёй задачай бязлітасную барацьбу з яўрэйскай нацдэмаўскай і соцыял-фашысцкай педагогікай і выходзячая ва ўсёй сваёй рабоце з пастановы ЦК ВКП(б) аб сярэдняй школе, дала такія работы, як: «Палітэхнічная школа па Марксу, Энгельсу, Леніну», «Барацьба на два фронты ў педагогіцы» (Зборнік), «Вучэбная работа ў школе» (зборнік), «Прыродазнаўства ў школе» і інш.

Літсекцыя, цесна звязаная з арганізацыямі совецкіх пісьменнікаў, падрыхтавала і апублікавала такія баявыя работы, як «За ленінскі этап у літаратурнай крытыцы» (зборнік), «Супроць антымарксісцкіх тэорый у літаратуразнаўстве» (зборнік), «Ленін і літаратуразнаўства», «Гісторыя яўрэйскага совецкага літаратуразнаўства», «Гісторыя яўрэйскай пролетарскай літаратуры ў Амерыцы» і інш.

Філалагічная секцыя, вядучая барацьбу з бундаўскім ідэалізмам, дала такія працы, як «Совецкі яўрэйскі арфаграфічны слоўнік», «Маркс, Энгельс аб мове», «Ленін, Сталін аб мове» і цэлы рад тэрміналагічных зборнікаў для патрабаванняў совецкага культбудаўніцтва сярод яўрэйскіх працоўных мас.

Этнаграфічная секцыя апублікавала некалькі зборнікаў, накіраваных супроць буржуазнага і соцыял-фашысцкага яўрэйскага этнаграфізма і фальклорызма.

Соцыяльна-эканамічная секцыя выпусціла такія работы, як «Дынаміка яўрэйскага насельніцтва на Украіне», паказаўшая, якія калосальныя змены адбыліся ў складзе яўрэйскага насельніцтва УССР у рэзультаце ўцягнення шырокіх мас яўрэйскай беднаты ў прамысловасці і соцыялістычную сельскую гаспадарку.

Урэшце гістарычная секцыя падрыхтавала некалькі баявых работ (напрыклад «Супроць нацменшавізма ў яўрэйскай гісторыяграфіі») накіраваных супроць нацдэмаўскай контрабанды ў яўрэйскай гістарычнай літаратуры.

Як мы бачым, работа інстытута (даўшага, дарэчы, за 1932 і 1933 г.г. звыш 400 друкаваных аркушаў навуковых прац) прасякнута большэвіцкім духам бязлітаснай барацьбы з класава-варожай, нацыяналістычнай і апартуністычнай ідэалогіяй, барацьбы за марксісцка-ленінскую большэвіцкую навуку.

Нараду з навукова-даследчай работай, Інстытут занят таксама і падрыхтоўкай новых кадраў высокакваліфікаваных навуковых работнікаў і прафесароў. Аб дасягненнях інстытута ў гэтай галіне сведчыць той факт, што не менш трэці яго ўласных супрацоўнікаў падрыхтаваны самім Інстытутам. У сучасны момант у Інстытуце навучаецца 28 аспірантаў, лік іх будзе яшчэ на працягу 1934 года даведзен да 40.

Інстытут цесна звязан з усёй пролетарскай грамадскасцю, прымае актыўнейшы ўдзел у соцыялістычнае сярод яўрэйскіх працоўных мас, арганізуе навуковыя і культурна-асветныя экспедыцыі ў яўрэйскія нацыянальныя раёны, у прыватнасці ў Біраджан, над якім ён шэфствуе і т. д. Усёй істотай сваёй і ўсёй сваёй работай Інстытут служыць мэтам інтэрнацыянальнага марксісцка-ленінскага выхавання працоўных мас. У руках партыі і совецкага ўрада Інстытут яўрэйскай пролетарскай культуры Усеукраінскай Акадэміі Навук, які прадстаўляе адну з яркіх праяў нашай ленінскай нацыянальнай палітыкі і які вядзе непрымірымую барацьбу з яўрэйскім нацыяналізмам, клерыкалізмам і бундаўскім нацдэмакратызмам, з'яўляецца моцна дзейчанай тэарытычнай зброяй.

Менск, друкарня «Звязды».

Адказны рэдактар Г. Н. Брагінскі.

Упаўн. Галоўлітбела № —К 2385.